№№43–44
(3380–3381)

25—28 сакавіка 2011 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

www.nv-online.info

Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*

Якуб КОЛАС

Амаль 300 грузавікоў стаялі пазаўчора пад вечар у чарзе на пераходзе "Каменны Лог"— "Мядзінінкай". У той жа час з літоўскага боку— прыкладна 400 машын. Во дзе "гробіцца" эканоміка!

РЭПРЭСІІ

Два гады зняволення лідару «Маладога фронту» (арганізацыя зарэгістравана ў Чэхіі) Зміцеру Дашкевічу і чатыры гады калоніі ўзмоцненага рэжыму яго паплечніку Эдуарду Лобаву — такія суровыя прыгаворы вынесены змагарам за свабодную Беларусь

Гэтыя прысуды на тле тых, якія цягам апошняга месяца гучаць то ў адным, то ў другім судзе, былі абсалютна прадказальнымі. Нягледзячы на тое, што фармальна хлопцаў абвінавацілі ў злосным хуліганстве, мала хто сумняваўся ў тым, што гэтая справа палітычная, справакаваная ўладамі, і з'яўляецца адной з дзясяткаў спраў, з якіх і складаецца ўся агульная справа за Плошчу.

Зміцер Дашкевіч неаднаразова заклікаў людзей сабрацца ў дзень галасавання на Кастрычніцкай. За дзень да акцыі ён разам са сваімі сябрамі перабраўся на арандаваную кватэру, бо быў упэўнены, што спецслужбы паспрабуюць нейтралізаваць яго перад акцыяй. Такое было не раз, калі актывістаў арыштоўвалі па надуманых абвінавачаннях напярэдадні гучных акцый і саджалі на суткі. Але ўпершыню падзеі дайшлі да крымінальнай справы ...

18 снежня Зміцер паведаміў праз скайп, што і каля кватэры, і каля пад'езда з'явіліся людзі ў цывільным. Апошнімі словамі было: "Усё роўна мы пойдзем. Паспрабуем прарвацца".

Праз некалькі хвілін пасля выхаду з пад'езда маладых людзей збілі з ног, адвезлі ў міліцыю, а потым абвінавацілі ў нападзе на двух прыстойных грамадзян. Класічная схема — падыходзяць да цябе хуліганы, просяць закурыць і пасля гэтага б'юць — беларускімі праваахоўнымі органамі была пастаўлена з ног на галаву.

Так званыя "пацярпелыя" на судзе не пажадалі нават паказаць свае твары. Яны давалі паказанні з-за дзвярэй, якія знаходзяцца за спінай суддзі. "Пацярпелыя" Алег Малышаў і Канстанцін Савіцкі (такія ў іх прозвішчы па версіі следства і суда) часам даволі груба адказвалі на пытанні адвакатаў, а калі тыя звярталі ўвагу на супярэчнасці ў пісьмовых матэрыялах справы і прасілі даць тлумачэнні, то яны раілі ім вывучаць расійскую граматыку. У той жа час гэтыя людзі казалі пра сябе, што ніколі не вучыліся і ніводнага дня нідзе не працавалі.

Паводле абвінавачання, Дашкевіч, Лобаў і Лазар выйшлі з дому, да іх падышлі некалькі "звычайных грамадзян", запыталі, які тут нумар дома, а заадно папрасілі цыгарэту. "Хуліган" Дашкевіч адразу кінуўся біцца. Тое, што ўсе тры хлопцы праз пару секунд ляжалі тварам да зямлі з заламанымі назад рукамі, што ў аднаго былі рассечаны вусны і твар у крыві, "пацярпелыя" патлумачылі так: мы "спынілі супрацьпраўныя дзеянні". Цікавы слэнг для беспрацоўных, ці не так? Аказваецца, сярод іх ёсць такія, якія мысляць і гавораць фразамі з міліцэйскіх пратаколаў. Больш за тое, гэтыя беспрацоўныя падчас бойкі не выпускалі мабільнікаў з рук і запытвалі: "Ну, дзе вы там? Давайце хутчэй!"

Далёка не ўсе ў нас так умеюць выклікаць міліцыю.

Сам Зміцер Дашкевіч назваў суд фарсам і паабяцаў, што наступіць час, калі тыя ж пракуроры, якія накіроўвалі справы ў суды, і тыя ж "пацярпелыя"-спецназаўцы самі паўстануць перад судом за незаконныя дзеянні.

Суддзю Маскоўскага раённага суда Мінска Алену Шылько, аднак, гэтыя дэталі крымінальнай справы не збянтэжылі. Вінаватымі прызнаны менавіта грамадскія актывісты.

Намеснік Зміцера Дашкевіча Мікола Дземідзенка ацэньвае прыгавор адназначна: "Тое, што хлопцаў затрымалі за дзень да правядзення буйной вулічнай акцыі, — гэта праява боязі і няўпэўненасці рэжыму перад сваім народам. Магчыма, калі б Зміцер быў на Плошчы, не адбылося б тых правакацый, якія мелі месца каля Дома ўрада. Але мы абсалютна перакананыя, што і Дашкевіч з Лобавым, і ўсе палітвязні выйдуць на волю раней пазначаных тэрмінаў".

Намесніца і сяброўка Зміцера Наста Палажанка сама знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Наста пасля абвяшчэння прыгавору ледзь стрымлівала слёзы: "Мне ўсё роўна, колькі гадоў турмы дадуць мне. Я засмучана, што разлучаюся з дарагімі мне людзьмі. Якая мне розніца, дзе чакаць сустрэчы з імі — на волі ці ў турме?"

Маці Эдуарда Марына Лобава прыходзіла на суд з іконкай Божай маці: "Я лічу сімвалічным, што нашых дзяцей пакаралі ў час посту. Думаю, што гэта нейкі знак усім. Я ганаруся сваім сынам і вельмі рада, што ён не зламаўся і ні на кога не паклёпнічаў. Захаваць сваю годнасць — дзеля гэтага цяпер трэба мець мужнасць. У нашых дзяцей яна ёсць".

Любоў ЛУНЁВА.
Фота Юліі ДАРАШКЕВІЧ.

Апошняе слова Зміцера Дашкевіча

— Я не буду даказваць, што я не хуліган. Не буду звяртаць увагу на супярэчнасці ў паказаннях пацярпелых. Але звярну ўвагу на тое, што даказвае, што мы апрыёры не маглі здзейсніць гэтае злачынства.

Мы з Эдуардам даўно займаемся палітычнай дзейнасцю. І мы хацелі дажыць на волі да 19 снежня. І не кідаліся б на людзей за дзень да "падпалу рэйхстага".

Калі б мы ўтрох з фомкай напалі на двух сексотаў, то яны б і сёння не прыцягнулі ногі ў суд. Тым, хто дадзеным судзілішчам хоча спыніць нашу палітычную дзейнасць, скажу: не спадзявайцеся! Цяпер вы мяркуеце, што вы ўсёмагутныя і непадкантрольныя. Калісьці так лічылі прыслужнікі Бакіева. Дойдзе час і да вас.

Будзе час, калі Савіцкі і Малышаў раскажуць, хто ім даваў загад рабіць гэтую правакацыю. Побач з імі будуць спецназаўцы і супрацоўнікі пракуратуры.

Вы — бедныя людзі, якія мусяць жыць у страху, калі скончыцца гэтая вашая ўсёмагутнасць. Дзень справядлівага суда набліжаецца.

Апошняе слова Дашкевіча прысутныя ў зале сустрэлі апладысментамі.

Аргкамітэт «Чарнобыльскага Шляху» ўзначаліў Юрый Хадыка

24 сакавіка ў Мінску на пасяджэнні Нацыянальнай каардынацыйнай рады дэмакратычных сіл створаны аргкамітэт па правядзенні акцыі "Чарнобыльскі Шлях", якую па традыцыі плануецца правесці 26 красавіка.

Аргкамітэт узначаліў доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Юрый Хадыка, але ўвайшлі ў яго прадстаўнікі ўсіх партый, ініцыятыў і грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўленых у каардынацыйнай радзе.

Бел-чырвона-белы сцяг у цэнтры Мінска. 24 сакавіка 2011 года.

Рэальны заробак знізіўся на 13,5%

У Беларусі рэальная заработная плата (разлічаная з улікам інфляцыі) знізілася ў лютым на 0,6% пасля зніжэння на 12,9% у студзені.

Намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата ў лютым склала 1,43 мільёна рублёў (каля 474 долараў). Такія даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі.

Па даных Белстата, у прамысловасці сярэдняя заработная плата склала 1,57 мільёна рублёў, у будаўніцтве — 1,66 мільёна рублёў, на транспарце і ў сувязі — 1,56 мільёна рублёў, у сельскай гаспадарцы, паляванні і лясной гаспадарцы — 949 тысяч рублёў, у адукацыі — 1,21 мільёна рублёў.

Заработная плата працаўнікоў аховы здароўя і прадстаўлення сацыяльных паслуг у лютым гэтага года склала 1,22 мільёна рублёў, у тым ліку ў галіне аховы здароўя — 1,25 мільёна рублёў. Нагадаем, што напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў улады старанна даводзілі сярэдні заробак да 500 долараў у эквіваленце. Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, налічаная сярэдняя зарплата працаўнікоў у Беларусі ў снежні 2010 года складала 1,6 мільёна рублёў (каля 530 долараў). Але згубілі мы гэтыя грошы вельмі хутка. Атрымліваецца, што за два месяцы ў сярэдняй зарплаце страцілі 60 долараў. Тэмпы ўражваюць.

КАШАЛЁК

Рыхтуйце грошы на талончык

Ужо ў бліжэйшыя дні талончыкі на праезд у мінскіх трамваях, тралейбусах і аўтобусах, а таксама жэтончыкі на метро стануць даражэйшымі.

Міністэрства эканомікі дало згоду на новыя тарыфы на перавозку пасажыраў гарадскім транспартам. У адпаведнасці з рашэннем, кошт адной паездкі складзе 850 рублёў. Нагадаем, што зараз талончыкі і жэтоны каштуюць 700 рублёў.

З 25 Сакавіка!

Зварот кіраўніцтва Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі — БНФ

Дарагія суайчыннікі!

Дзень 25 сакавіка — знамянальная гістарычная дата для беларускага народа. У гэты дзень 93 гады таму нашыя продкі аб'явілі аб незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, адкрылі шлях беларускаму народу да дзяржаўнага будаўніцтва і нацыянальнага адраджэння.

Агрэсары і акупанты з усходу і захаду не далі тады нашаму народу (які не паспеў стварыць войска) рэалізаваць свае светлыя памкненні. Акупанты знішчылі БНР, залілі абшары нашай Бацькаўшчыны крывёй, забівалі інтэлігенцыю, вынішчалі насельніцтва. Але памяць пра Незалежную Рэспубліку жыла сярод нашага народа, давала надзею на адраджэнне незалежнай дзяржавы ў будучыні.

У гістарычных варунках распаду СССР беларускі народ, маючы наперадзе змагання свой авангард — Беларускі Народны Фронт, аднавіў незалежнасць краіны 25 жніўня 1991 года.

Але непрыяцелі беларускага народа не жадалі роскві́ту Беларусі. Нядаўнія падзеі ў краіне, што былі звязаны з чарговай прэзідэнцкай кампаніяй, паказалі: у сённяшняга рэжыму няма мінімальных маральных нормаў і прыстойнасці, павагі да закона. Ужыўшы грубую сілу супраць мірнага цывільнага насельніцтва, ён праводзіць цынічныя судзілішчы над збітымі і зняважанымі людзьмі, выстаўляючы супраць іх абсурдныя і здзеклівыя абвінавачанні.

Сёння чарговая дата абвяшчэння БНР. Рэжым адмовіў Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі — БНФ па надуманай прычыне ў правядзенні святочных мерапрыемстваў на вуліцах беларускай сталіцы. (Рэжым здзекуецца з беларусаў, то адпраўляючы святкаваць на "сабачнік", то прыдумляе неіснуючыя прычыны, каб адмовіць у правядзенні мерапрыемстваў).

Мы лічым, што ў гэтых умовах не маем права заклікаць беларусаў да ўдзелу ў масавых вулічных мерапрыемствах, падстаўляць людзей пад рэпрэсіі. Але мы ведаем: прыйдзе дзень, калі ў вольнай Беларусі вольна загучыць голас беларуса і ў святочныя, і ў будзённыя дні на плошчах і вуліцах нашых гарадоў і вёсак. Будзем жа яднацца ў змаганні, збіраць сілы і нацыянальнай працай набліжаць гэты дзень.

Віншуем беларусаў з 25 САКАВІКА! Заклікаем сапраўды пасвяточнаму адзначыць гэты дзень, павіншаваць родных і знаёмых, ускласці кветкі да помнікаў выдатных людзей Беларусі, перадаць свой святочны настрой іншым людзям.

Нам трэба гуртаваць сілы, яны спатрэбяцца, калі надыдзе час. Заклікаем злучацца ў рух за новыя выбары без Лукашэнкі, ствараць суполкі руху, сёння рыхтаваць будучыню краіны.

Са святам! Жыве Беларусь!

«Кошт» Чарнобыля: 235 мільярдаў долараў

Урон, што быў нанесены Беларусі чарнобыльскай катастрофай, ацэньваецца ў 235 мільярдаў долараў. Такую суму агучыў Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі.

Напярэдадні 25-годдзя з дня катастрофы беларускія спецыялісты падлічылі, што:

— найбольшую долю (81,6%, альбо 192 мільярды долараў) складаюць затраты на падтрымку работы вытворчасці і ажыццяўленне ахоўных мер;

— на долю прамых і ўскосных страт эканомікі прыходзіцца каля 30 мільярдаў долараў (12,6%);

— упушчаная выгада пры гэтым ацэнена ў 13,7 мільярда долараў (5,8%). Гэтая сума ўзнікла з-за таго, што з абароту былі выведзены больш за 2 тысячы квадратных кіламетраў сельгасугоддзяў, радовішчы мінеральна-сыравінных рэсурсаў, каля чвэрці лясного фонду трапілі пад радыяцыйнае забруджанне і так далей.

Як адзначаецца, падведзеная ацэнка ўрону не з'яўляецца канчатковай.

ОФИЦИАЛЬНО

Цены на газ и электричество будут расти

В Беларуси планируется повышение цен на газ и электричество для населения. Официально это называется "поэтапная ликвидация перекрестного субсидирования в ценах на газ и тарифах на энергию".

Это предусмотрено проектом Государственной программы развития белорусской энергетической системы на 2011—2015 годы, который 23 марта был рассмотрен на заседании президиума Совета Министров Республики Беларусь.

Министр энергетики Беларуси Александр Озерец обещает, что рост тарифов будет плавным и безболезненным, с учетом вопросов социальной защиты населения. Экономисты, правда, спорят, кто в итоге платит за электроэнергию и газ больше — население или предприятия и кто кого на самом деле субсидирует. Но правительство упорно стоит на том, что за население платит реальный сектор экономики. Эту нагрузку с *заводов планируется снять.*

"От этого нужно уходить, так как та перекрестка, которая ложится на газ, моментально ложится и на выработку энергии", — пояснил Александр Озерец. *"Поэтому мы уходим от этой перекрестки, что существенно разгружает финансовый пресс на реальный сектор экономики. Естественно, немного будет подгружаться население, но мы знаем, что к 2015 году ставится задача выйти на среднюю заработную плату в 1 тысячу долларов в эквиваленте. Поэтому с учетом этого и будет построена работа, чтобы население на себе резких нагрузок не почувствовало"*, — цитирует министра информационное агентство БЕЛТА.

В Беларуси давно так: один чиновник радостно обещает рост зарплат, а другой подписывает документы, чтобы этот "рост" отобрать.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—28 САКАВІКА 2011 г.

ЖЕНСКИЙ ВЗГЛЯД

Людмила МИРЗАЯНОВА:

«Я понимаю, что ничего не могу сделать для сына...»

Многим сложно понять, что чувствует мать, когда ее ребенок — примерный во всех отношениях парень — попадает в тюрьму.

Кандидат психологических наук, известный ученый и педагог Людмила Мирзаянова даже в страшном сне не могла представить, что когда-нибудь ей придется ездить в СИЗО почти как на работу...

Досье «Народной Воли»

Студент 3-го курса Белорусского государственного экономического университета Федор Мирзаянов — 38-й обвиняемый по уголовному делу о массовых беспорядках.

Обвинение ему было предъявлено 1 февраля.

Как сообщает сайт незарегистрированного правозащитного центра "Весна", Федора на 26 января вызвали в КГБ в качестве свидетеля по делу о массовых беспорядках, однако 25 января утром к нему домой приехали сотрудники МВД, которые доставили его на допрос в следственное управление по улице Саперов в Минске. По результатам допроса Федор был взят под стражу на 3 суток и помещен в изолятор временного содержания на ул.Окрестина в качестве подозреваемого в совершении преступления по статье "Массовые беспорядки". 1 февраля ему было предъявлено обвинение, ему грозит от 3 до 15 лет лишения свободы

Федор Мирзаянов за участие в акции протеста 19 декабря в Минске отбывал административный арест сроком 15 суток в Жодино. Молодой человек не является членом партий или демократических молодежных организаций.

Отец Федора Рим Мубарякович Мирзаянов — талантливый инженер по автоматизации в нефтегазовой отрасли, сейчас стажируется в Голландии. Мама Федора — Людмила Мирзаянова — известный ученый, кандидат психологических наук, доцент, отличник народного образования Беларуси, неоднократно награжденная за вклад в развитие одаренной молодежи и развитие высшего образования в стране (в том числе премиями Фонда Президента). При ее непосредственном участии создавалась научно-методическая база нынешнего Барановичского государственного университета.



Федор Мирзаянов с родителями. Январь 2011 г.

Сердце матери

— Я живу сейчас только новостями, — *рассказывает Людмила Федоровна.* — Слежу за подробностями судов над участниками акции 19 декабря. Наука и творчество ушли в сторону. Каждое утро начинаю с просмотра независимых интернет-сайтов, читаю прессу, встречаюсь с однокурсниками Федора. Должна была поехать в Голландию к мужу, но как только узнала, что сына перевели в очень плохую переполненную камеру на Володарского, сдала билет. Пусть я не вижу его, но мы рядом...

В сознании каждая вторая мысль о Федоре... Вчера вот лекарства ему передала, в том числе от стресса. За время заключения у него были проблемы с желудком, ухудшилось зрение, в последние дни появились боли в спине. Меня очень удручает, что в СИЗО нельзя передавать молочные продукты, вареное мясо ни в каком виде. Я раньше как-то не задумывалась, почему люди из тюрем выходят больными, а теперь понимаю... Если есть какие-то погрешности с желудком, кишечником, то в условиях заключения они только усугубятся. Они же там прямо в камере и стирают, и сушат, и курят... Камера, в которой до недавнего времени находился Федор, была переполнена. У него, как и у многих других, не было своего места для сна...

В 30 разрешенных килограммов передачи на месяц входит и вес вещей. Передашь куртку с капюшоном — пять килограммов как не бывало!

За это время у меня сформировался новый круг общения: я познакомилась с мамами политзаключенных. Мы созваниваемся, делимся проблемами, вместе ездим в женский монастырь.

Общение — это взаимообогащение. Правда, когда общаются мамы находящихся в СИЗО ребят, происходит обмен такой печальной информацией, что вместо одного повода для переживаний появляется много...

А на Володарского я уже езжу как на работу...

Зубы на ладошке

— Политикой Федор никогда не занимался, — *говорит Людмила Федоровна.* — В 11-м классе, как и все, стал членом БРСМ. Но активной деятельности по этой линии не было. В школе он возглавил команду по интеллектуальной игре, состязался в способности мыслить креативно с аналогичными командами из других школ и гимназий, был серьезно вовлечен в олимпиадное движение.

В вузе он тоже политикой не занимался. Хотя читал газеты, журналы, следил за событиями, происходящими в мире.

В ходе президентской кампании не был членом каких-то команд, не входил в штабы. 19 декабря он проголосовал и отправился в "Макдональдс". Вышел оттуда как раз тогда, когда мимо шла толпа людей на площадь Независимости. Пошел и Федор. Для него это было первое участие в подобной акции и первое живое слово кандидатов в президенты. Но за это он может получить от 3 до 15 лет...

Когда загоняли участников площади в автозаки, он не стал сопротивляться. Рассказывал, что получил удар по спине, что в автозаке продержали около шести часов. Было холодно, он простудился. Рассказывал, что ему было страшно: видел парня с выбитыми зубами, которые тот держал в ладошке и все просил, чтобы ему оказали помощь...

Через суды прогнали очень быстро. Федор рассказывал, что по протоколу у него был свидетель-милиционер, но он не явился в суд. Федор не признал свою вину. Сказал, что ничего не ломал, ни с кем не дрался, а на площадь он имел право прийти. Ему дали 15 суток. Мы с мужем беседовали с судьей. Она сказала, что запомнила нашего сына, вспомнила, как он спрашивал о милиционере-свидетеле, как твердо заявил, что ни в чем не виноват...

Как только он оказался в Жодино, у него поднялась температура, которая держалась несколько дней. Врач к нему пришел только на четвертый день. Он, кстати, написал жалобу прокурору на решение суда. Из прокуратуры прислали ответ, что жалобу не рассматривали, т.к. он не заплатил пошлину. А как он ее мог заплатить, если переписка была запрещена?..

Дерзкий смех

— Я верю, что сын ни в чем не виноват, — *абсолютно спокойно, но в то же время уверенно говорит Людмила Мирзаянова.* — Мы с Федором беседовали о том, что случилось. И я, кстати, рассказывала об этом главному следователю, который ведет дело о массовых беспорядках.

Когда началась вторая волна арестов, мы с мужем предлагали сыну уехать. Мы сказали ему: *"Тебя ждут вузы в Южно-Сахалинске, Уфе, Москве. Выбирай любой".* Он твердо ответил: никуда не уеду, я ни в чем не виноват.

В январе он сдал четыре зачета и три экзамена. Последний экзамен должен был сдавать 25 января. Но в этот день рано утром сотрудники правоохранительных органов пришли к дому Федора, потребовали открыть дверь. Он не впустил их. Позвонил дяде, дождался, пока тот приедет, и только тогда открыл дверь. Его арестовали...

Три дня Федора держали на Окрестина. Ему сразу предложили: *"Дай признательные показания, и мы тебя отпустим".* В своем первом письме из СИЗО Федор написал, что от него требовали назвать организации, к которым принадлежит, и суммы денег, которые получал. Федор говорил правду: денег не получал, ни в какой организации не состоит. Для нас вопрос о деньгах вообще смешной: у нас обеспеченная семья, сын никогда ни в чем не нуждался. Однако о деньгах его постоянно спрашивали во время допросов. Во время одного из них он просто не выдержал и засмеялся. Это была защитная реакция, сын просто устал от бредовых обвинений. Но следователи расценили его поведение как дерзкое...

Мы предпринимали все возможное, чтобы ему изменили меру пресечения. Хотели внести залог. Нам предложили возместить ущерб в размере 27 миллионов белорусских рублей, при этом не гарантировали изменение меры пресечения. Мы были готовы заплатить любую сумму. Я попросила адвоката уведомить об этом Федора. Сын сказал: "Ни за что! Я ничего не делал противозаконного, я не бил, не ломал, не жег! За что вы собираетесь платить деньги?!" И мы не стали этого делать...

За это время он написал близким около 60 писем. Он пишет каждый день. И в каждом письме подчеркивает, что не понимает, в чем его обвиняют.

Пытка без слез

— Для нас вся эта ситуация просто пытка, — *тихо говорит Людмила Федоровна.* — Я окаменела. Работать не могу. И плакать не могу. Хотя за это время плакала дважды. Первый раз, когда из письма узнала, как ему тяжело в камере. Он написал: *"Единственный час, когда я свободно дышу, — это время прогулки".* А второй раз, когда ко мне после ареста Федора пришли его одногруппники. Они вошли с веткой белых хризантем, первым вошел парень, с которым Федя дружил с детства. И я просто не смогла сдержать слез...

Штрихи к портрету

— Все это время я как будто книгу пишу о Федоре, — *признается моя собеседница.* — Вспоминаю какие-то факты из его жизни, вдруг очень важными становятся какие-то мелочи...

...Когда Феде было девять месяцев, моя мама пыталась его научить делать "сороку-воровку". Для нее это как тест на интеллект. А он ни в какую! *"Мама, я не люблю, когда мне что-то навязывают...",* — прокомментировал сын ситуацию, повзрослев. Независимым он и шел по жизни.

...Его любимый город — Несвиж, там живет моя мама. Она впервые привела Федора в православную церковь. Младшим школьником он мог проводить там по несколько часов, ему там было комфортно. Его вторая бабушка (по-татарски "ненейка") живет в Уфе. Она мусульманка, читает Коран на арабском языке.

...Он с детства отстаивал свои права. Как-то в Несвиже Федор с ребятами играл в футбол (было ему тогда лет 8). Мяч попал на клумбу, и соседка его забрала. Детишки сутки потерпели, а затем Федор принес книгу о правах детей, которая была у нас дома. Ребята внимательно изучили положения и решили написать жалобу. Бумагу отнесли женщине, которая забрала мяч... *"От горшка три вершка, а ведут борьбу за свои права",* — возмутилась та, но мяч отдала.

...Во дворе бабушкиного дома в Несвиже Федор с друзьями соорудил столик и скамейку, за которым играли в шашки, нарды, шахматы. Он по натуре созидатель, а не разрушитель.

...В шестом классе Федор поехал в Италию, стал участником кинофестиваля детских фильмов. Я переживала: все же первая далекая поездка, но мне сказали, что оттуда ребята приезжают другими, осознав свою успешность и компетентность. И он на самом деле приехал другой. Его вера в себя только укрепилась!

...Становление его характера шло во многом под влиянием книги. Он еще в школе в пятом классе по двум книгам о Великой Отечественной войне сопоставил данные о производстве стали, электроэнергии, угля в Германии и Советском Союзе и пришел к выводу, что мы с такой экономикой не могли выиграть войну. И спросил у отца: *"Как же мы победили?"* Муж ему объяснил: есть вещи посильнее экономики, это дух народа... На Федора это произвело впечатление. Несмотря на то что Федор страдает с рождения мигренью и тяжело переносит большие нагрузки, у него большая сила воли. Вы даже не представляете!

...Федор считает, что не обладает математическими способностями, но благодаря своим преподавателям и собственным усилиям поступил на факультет менеджмента БГЭУ по специальности "экономическая кибернетика", имея по итогам тестирования самый высокий балл (340).

Я все время думала, что его вот-вот освободят и он снова вольется в учебный процесс. Он и сам уверен в том, что его отпустят на свободу. Какой когнитивный диссонанс может быть у Федора, когда в суд приведут 30 спецназовцев, готовых свидетельствовать против него, как это было во время суда над Никитой Лиховидом!..

...В 11-м классе Федор стал крестным отцом дочери своего старшего брата. В церкви на церемонии он был серьезным и торжественным. Он очень трогательно заботится о своей племяннице. Она прислала ему в СИЗО письмо с рисунком и фразой: *"Федор, тебе 21 год, ты живешь в 21-м веке, ты будешь счастлив!"*

...Федор не любит дискотеки. В свободное время предпочитает чтение и интеллектуальные игры с одногруппниками.

Тюремные университеты

Мера пресечения Федору Мирзаянову продлена до 25 мая.

— Я не знаю, зачем его держат в заключении? Кому это нужно? Какая польза от этого обществу? — *недоумевает Людмила Федоровна.* — Иногда мне хочется задать эти вопросы бывшему и нынешнему министрам образования Александру Радькову и Сергею Маскевичу. Знают ли они, что в тюрьмы из-за политики по надуманным предлогам заключены достойные студенты белорусских вузов? Камеры переполнены, в них холод, плохое освещение, тяжелая атмосфера (увы, не все могу назвать — очень опасаюсь за жизнь и здоровье сына) — условия, которые просто убивают человека морально и физически...

Я понимаю, что почти ничего не могу сделать для сына там... Он там, в этой страшной камере... Да и мы, родители, сами в этой ситуации, как в камере...

Марина КОКТЫШ.

Чэхія дала прытулак Міхалевічу

Экс-кандыдат у прэзідэнты Алесь Міхалевіч атрымаў палітычны прытулак у Чэхіі.

Уцёкі Міхалевіча з краіны далі беларускай пракуратуры падставы фактычна адмовіцца ад разгляду ягоных заяў пра катаванні ў следчым ізалятары КДБ.

Міхалевіч з Чэхіі даручыў сваёй жонцы Мілане даведацца, якім чынам ён можа даць тлумачэнні беларускай пракуратуры на гэты конт: праз адваката, з дапамогай натарыуса альбо даць паказанні нейкім іншым спосабам. Але супрацоўнік пракуратуры, які падпісваў Алесю Міхалевічу пазоў з выклікам для дачы тлумачэнняў адносна заяў пра катаванні, паведаміў жонцы экс-кандыдата ў прэзідэнты, што Міхалевіч мусіць даваць гэтыя тлумачэнні толькі асабіста і толькі на тэрыторыі Беларусі. На ўсе іншыя прапановы следчы адказаў адмовай. Ён патлумачыў, што ў паказаннях вельмі зацікаўлены, але заканадаўства патрабуе выканання працэдуры — следчы мусіць асабіста патлумачыць Міхалевічу яго правы і папярэдзіць пра крымінальную адказнасць.

Такім чынам, справа пра катаванні пакладзена ў стол.

Ірына МАЛЬЦАВА.

Рада беларускай інтэлігенцыі прапанавала аб'яднацца ва ўсенародны рух

Грамадзянская ініцыятыва "Рада беларускай інтэлігенцыі" прапаноўвае ўсім дэмакратычным структурам — партыям, рухам і грамадскім арганізацыям — аб'явіць мараторый на палітычную канкурэнцыю і аб'яднацца ва ўсенародны рух, паведамляе БелаПАН.

На думку аўтараў заявы, стварэнне руху дазволіць дэмакратычным сілам аб'яднацца дзеля *"далучэння ўсіх беларускіх грамадзян, якія жадаюць дэмакратычных перамен у краіне, да патрабавання спынення палітычных рэпрэсій, вызвалення ўсіх палітычных вязняў і адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі, які незаконна займае пасаду прэзідэнта".*

У заяве падкрэсліваецца, што ўсе спробы перашкаджаць кансалідацыі, дзейнічаць сепаратна, шукаць "дыялогу" з уладамі, удзельнічаць у імітацыі выбараў нельга расцэньваць іначай як калабарацыянізм і здраду інтарэсам народа.

Старшыня Рады кінарэжысёр і педагог **Уладзімір Колас** адзначыў, што выбары і падзеі, якія адбыліся 19 снежня 2010 года і пасля, пацвердзілі, што механізм выбараў выкарыстоўваецца ўладамі толькі дзеля імітацыі народнай падтрымкі. Паводле яго слоў, падзеі 19 снежня на сталічнай плошчы Незалежнасці паказалі, што беларускае грамадства даўно саспела да дэмакратычных перамен і заклікае тых, хто прэтэндуе на лідарства ў дэмакратычным руху, да кансалідацыі, мэтанакіраваных і адказных дзеянняў.

Першы з асуджаных пайшоў па этапе

Асуджанага за падзеі 19 снежня Аляксандра Малчанава перавялі з Мінска ў Магілёўскую калонію. Пра гэта праваабаронцам паведаміла ягоная маці.

Аляксандр Малчанаў быў асуджаны на 3 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму за ўдзел у акцыі пратэсту 19 снежня. Прысуд, вынесены ў Фрунзенскім судзе 2 сакавіка, быў ім абскарджаны. Аляксандр мусіў чакаць разгляду сваёй касацыйнай скаргі ў СІЗА. Але, як стала вядома, ён падаў пісьмовы зварот з просьбай перавесці яго са следчага ізалятара ў калонію. Аналагічную заяву, дарэчы, напісаў і Аляксандр Атрошчанкаў. Вязні імкнуцца трапіць у калонію, спасылаючыся на тое, што ўмовы ўтрымання ў СІЗА невыносныя.

БЛІЦ

Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з расійскімі журналістамі агучыў сваё бачанне прычын, з-за якіх у краіне ўзніклі праблемы з валютай. Аказваецца, сітуацыю "спрабуе дэстабілізаваць Міжнародны валютны фонд".

Было сказана: "Вось МВФ заяўляе, што ў вас (маецца на ўвазе Беларусь) з валютай дрэнна. Людзі спужаліся, пабеглі ў абменныя пункты. Але мы свае абавязкі перад насельніцтвам выконваем і будзем выконваць. Але, тым не менш, абстаноўку спрабуюць дэстабілізаваць".

Мы вырашылі запытацца ў эканамістаў:

Ці вінаваты МВФ у ажыятажы на валютным рынку Беларусі? І хто ў ім вінаваты?

Леанід ЗАЇКА:

— У валютных праблемах, якія зараз ёсць у Беларусі, вінаваты той, хто прыдумаў, што сярэдні заробак у Беларусі павінен складаць 500 долараў. На пачатку мінулага года сярэдні заробак складаў 330 долараў, а пад канец года — 500. Дзе ўзяць па 170 долараў на зарплату для ўсяго насельніцтва краіны? Другое. Хто прыдумаў перад выбарамі падняць заробкі настаўнікам і ўрачам на 35%? Няўжо МВФ прыдумаў падняць пенсіі перад тымі ж выбарамі? У краіне быў парушаны баланс паміж даходамі і расходамі. Мы купілі тавараў на 10 мільярдаў долараў больш, чым прадалі. Ізноў МВФ вінаваты? Канечне, у праблемнай сітуацыі з валютай у Беларусі вінавата дрэнная праца эканомікі.

Леанід ЗЛОТНІКАЎ:

— Як бы ні працавала эканоміка, валюта ў банках магла б быць пры адной простай умове: у замежных грошай павінен быць вольны курс у адносінах да нацыянальнай валюты. Беларускі ўрад падтрымлівае курс нацыянальнай валюты большым, чым можа дазволіць сабе эканоміка. На гэта трацяцца грошы са знешніх крэдытаў. Самае страшнае ў тым, што мы такім чынам праядаем больш, чым можа дазволіць сабе наша эканоміка. Беларусь жыве не па сродках. Зараз золатавалютныя рэзервы краіны прыкладна 4 мільярды долараў. Гэтага хопіць толькі на два месяцы для набыцця імпарту. А крытычная велічыня, крытычны парог — тры месяцы. Такім чынам, узровень золатавалютных рэзерваў ніжэй за крытычную велічыню. Адсюль і праблемы на валютным рынку Беларусі. Другая важная прычына ў тым, што валюты ў краіну ў першым квартале гэтага года паступіла менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. І рэзерваў няма. Калі так далей пойдзе, то мы ўпэўнена прыйдзем да дэфолту. Кажучы прасцей, мы праямо тое, што ёсць зараз, і аддаваць пазыкі не будзе чым... Урад разлічваў, што ў гэтым годзе, як і ў мінулыя, будзе набіраць крэдыты і за кошт гэтага падтрымліваць сітуацыю на ранейшым узроўні. Аднак гэтага не адбываецца, крэдытаў нам пакуль не далі. Адсюль і праблемы на валютным рынку краіны.

Сяргей ЧАЛЫ:

— Да таго, каб сітуацыя з валютай стала такой, як зараз, Беларусь ішла даўно. Яшчэ ў апошнія тры месяцы мінулага года насельніцтва скупіла паўтара мільярда долараў, пра якія і казаў Пракаповіч. Плюс, свой унёсак зрабіў і МВФ, прааналізаваўшы сітуацыю ў нашай эканоміцы і парэкамендаваўшы рабіць дэвальвацыю. Але тут ёсць яшчэ адзін момант: сам Нацбанк яшчэ ў студзені гэтага года здзейсніў самастрэл. Тады Нацбанкам быў вызначаны парадак пакупкі валюты камерцыйнымі банкамі для абменнікаў толькі цягам першых трох дзён месяца і толькі ў памеры чыстага продажу валюты насельніцтву за мінулы месяц. І атрымалася наступная карціна. У студзені насельніцтва валюту скупала больш-менш нармальна, попыт быў, але ў лютым ён значна паменеў. Такім чынам, у сакавіку банкі змаглі закупіць вельмі мала валюты. Купілі мала, а людзі пабеглі ў абменнікі, падагрэтыя чуткамі аб дэвальвацыі. Як вынік — грошы ў абменніках скончыліся вельмі хутка. Але тыдзень Нацбанк рабіў выгляд, што ўсё нармальна і толькі потым прызнаў крытычную сітуацыю. Валютны крызіс — вынік непрадуманай грашова-крэдытнай палітыкі ў Беларусі. Для эканомікі, якая і так працуе з апошніх сіл, павышэнне пенсій, зарплат, стаўкі першага разраду аказаліся проста непад'ёмнымі...

Станіслаў БАГДАНКЕВІЧ:

— Закон эканомікі такі: павінен утрымлівацца баланс паміж імпартам і экспартам. Але наша эканоміка так не працуе.

З-за гэтага і ўзнік валютны крызіс. Валюты не хапае для аплаты імпарту, які ідзе ў Беларусь. У нас няма грошай, каб плаціць за сыравіну, нафту і газ, мы іх проста не зарабілі, маем імпарт большы, чым экспарт. Для нармальнай працы эканомікі Беларусі не хапае 10 мільярдаў долараў. Таму ўлада і абмяжоўвае продаж валюты для насельніцтва, штучна зніжае попыт на яе. Зараз урад працуе так, як і раней: тэрмінова спрабуе атрымаць крэдыт ад Расіі памерам у тры мільярды долараў. Грошы патрэбны ў першым паўгоддзі. Калі мы пазыку атрымаем, то праблема адсунецца на другую палову года. Каб пазбегнуць дэвальвацыі, уладзе тэрмінова патрэбны грошы. Калі іх не будзе, сітуацыя будзе пагаршацца і далей... Курс валюты павінен вызначацца рынкам, а не адміністрацыйным рэсурсам. Вось і ўсё.

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

Ляпнуў дзвярыма

Капітан міліцыі ў адстаўцы з Івацэвічаў **Станіслаў Халадовіч** выключаны з Саюза ветэранаў МУС.

Заяву аб выключэнні Халадовіч напісаў сам яшчэ 10 лістапада 2010 года. Прычынай стала тое, што на ўрачыстай частцы святкавання Дня ветэранаў яму не далі да канца зачытаць зварот, каб Саюз ветэранаў МУС краіны выступіў з ініцыятывай незалежнага расследавання справы знікнення былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі. Заява амаль чатыры месяцы заставалася без разгляду, і толькі ў Дзень міліцыі была задаволена. Станіслаў Халадовіч лічыць, што яго выключэнне прымеркавана да святочнай даты нездарма. Ён быў удзельнікам падзей на Плошчы, за што адбыў 10 сутак арышту ў Жодзінскай турме. Магчыма, міліцэйскае начальства палічыла, што такімі дзеяннямі ён заплямію калектыў, і пляма была "змыта" публічна ў Дзень міліцыі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Паміж турмой і пятлёй

Сталі вядомымі некаторыя падрабязнасці трагедыі, што адбылася ў Гродне, дзе 8 сакавіка дасталі з пятлі палкоўніка міліцыі, начальніка абласнога Дэпартамента аховы ***Вадзіма Раманюка****.*

Як паведаміла газета "Вячэрні Гродна", напярэдадні трагедыі Генеральная пракуратура ўзбудзіла ў адносінах да Раманюка крымінальную справу па артыкуле "Злоўжыванне ўладай і службовымі паўнамоцтвамі".

Высветлілася, што пракуратура зацікавілася Раманюком яшчэ ў 2009 годзе. Тады следчы пракуратуры Жабінкаўскага раёна правяраў, ці няма ў дзеяннях міліцыянераў злоўжывання паўнамоцтвамі. Інфармацыю для праверкі перадалі ў КДБ. Раманюка падазравалі ў тым, што, працуючы ў раённым аддзеле, ён выкарыстоўваў на асабістыя мэты службовы аўтатранспарт. Правяраліся таксама звесткі, што падначалены Раманюка ў службовы час быў заняты не на службе, а на лецішчы начальніка. Па выніках праверкі, ва ўзбуджэнні крымінальнай справы было адмоўлена. Тым не менш у гэтым годзе Генеральная пракуратура вырашыла вярнуцца да той справы і ўзбудзіла яе зноў.

Саслужыўцы не выключаюць, што менавіта гэта і падштурхнула палкоўніка міліцыі да пятлі.

Нагадаем, што з Брэста ў Гродна Раманюк прыехаў чатыры гады таму. На пахаванні, нягледзячы на таямнічыя абставіны смерці, былі амаль усе ягоныя саслужыўцы.

Алег СНОЎ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—28 САКАВІКА 2011 г.

«ЧОРНЫЯ» СПІСЫ

Неўязных паболела

У спіс беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у Еўрасаюз, дададзены новыя прозвішчы.

Спіс са 156 чалавек даповнены прозвішчамі ў асноўным суддзяў і пракураў, якія ўдзельнічалі ў судовых працэсах над удзельнікамі акцыі 19 снежня. Таксама сюды трапілі рэктары беларускіх ВНУ, адказныя за выключэнні студэнтаў па палітычных матывах.

Ітак, не здолеюць трапіць у Еўропу:

ГАЙДУКЕВІЧ Валерый Уладзіміравіч — камандуючы ўнутранымі войскамі, намеснік міністра ўнутраных спраў;

ГУРЭЕЎ Сяргей Віктаравіч — намеснік міністра ўнутраных спраў, начальнік папярэдняга расследавання МУС;

КАЧАНАЎ Уладзімір Уладзіміравіч — саветнік міністра юстыцыі;

БОДАК Ала Мікалаеўна — намеснік міністра юстыцыі;

СІМАНАЎ Аляксандр Анатольевіч — намеснік міністра юстыцыі;

ТУШЫНСКІ Ігар Геранінавіч — намеснік міністра юстыцыі;

СКУРАТ Віктар — начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення дэпартамента аховы МУС;

ІВАНОЎ Сяргей — намеснік начальніка аддзела камплектавання ўпраўлення ідэалагічнай працы і кадравага забеспячэння ГУУС Мінгарвыканкама;

КАДЗІН Раман — камандзір роты баявога і тэхнічнага забеспячэння Палка міліцыі спецыяльнага прызначэння ГУУС Мінгарвыканкама;

КАМАР Вольга — суддзя суда Фрунзенскага раёна Мінска (справа Васіля Парфянкова);

ЗАГАРОЎСКІ Антон — пракурор суда Фрунзенскага раёна (справа Васіля Парфянкова);

ЧАРКАС Таццяна Станіславаўна — суддзя суда Фрунзенскага раёна Мінска (справа Аляксандра Атрошчанкава, Аляксандра Малчанава і Змітра Новіка);

МАЛАДЦОВА Таццяна — пракурор суда Фрунзенскага раёна Мінска (справа Аляксандра Атрошчанкава, Аляксандра Малчанава і Змітра Новіка);

ЛЯБЕДЗІК Міхаіл Пятровіч — першы намеснік галоўнага рэдактара газеты СБ "Беларусь сегодня";

ПАДГАЙСКІ Генадзь Данатавіч — дырэктар Мінскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа;

КУХАРЧЫК Пётр Дзмітрыевіч — рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта;

БАТУРА Міхаіл Паўлавіч — рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі;

ЧАСНОЎСКІ Мечыслаў Эдвардавіч — рэктар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна;

АЛПЕЕВА Тамара Міхайлаўна — рэктар Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута.

ТЫМ ЧАСАМ

Афіцыйны Саюз журналістаў, які ні слова не сказаў у падтрымку калег, якіх беларускія ўлады арыштоўвалі, збівалі, высылалі з краіны, не ўпускалі ў краіну, адбіралі тэхніку і так далей, — заступіўся за прапагандыстаў, што патрапілі ў спісы неўязных. На пасяджэнні сакратарыята ГА "Беларускі саюз журналістаў" прыняты зварот да Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, спецыяльнага дакладчыка Савета ААН па правах чалавека, прадстаўніка АБСЕ па свабодзе СМІ. У ім гаворыцца: "Можна з упэўненасцю заявіць, што беларускія журналісты трапілі пад санкцыі з боку ЕС выключна з прычыны таго, што адстойвалі свой пункт погляду напярэдадні, падчас і пасля прэзідэнцкіх выбараў... " Проста дзіва, як хутка яны ўспомнілі пра свабоду СМІ, пра свабоду выказвання думак і меркаванняў, калі санкцыі прайшліся па іх! Як раптоўна ім спатрэбіліся спасылкі на правы чалавека!

«Белнафтахім» плануе абмежаваць продаж бензіну

Пра гэта гаворыцца ў каментарыі, апублікаваным на сайце канцэрна.

Паводле яго, такія меры будуць прыняты, каб *"не дапусціць далейшага павелічэння вывазу за мяжу бензіну і дызельнага паліва, набытых на беларускіх АЗС, і прычынення шкоды эканоміцы краіны"*.

У дакуменце адзначана, што *"ад незаконнай дзейнасці некаторых грамадзян, якія займаюцца вывазам паліва за межы краіны, матэрыяльную шкоду атрымлівае большасць беларускага насельніцтва"*.

Пакуль не вядома, якія менавіта меры збіраецца прымаць канцэрн. Па адной з версій, могуць быць уведзены талоны.

Дайшла чарга да хлеба

У сакавіку і красавіку цэны на хлеб могуць вырасці на 10%. Падаражанне прадугледжана рашэннем Міністэрства эканомікі:

"У мэтах кампенсавання падаражання збожжавай сыравіны і ў сувязі са стратнасцю вытворчасці хлеба жытняга і жытня-пшанічнага, які не адносіцца да заварных гатункаў, прадугледжана павышэнне ў сакавіку і красавіку 2011 г. адпускных коштаў на хлеб і няздобныя булачныя вырабы па 1,7—5% у месяц".

Эстонскія візы сталі для беларусаў бясплатнымі

Эстонія адмяніла консульскі збор за доўгатэрміновую нацыянальную візу для грамадзян Беларусі.

Такое рашэнне было прынята днямі на пасяджэнні эстонскага ўрада. Міністр замежных спраў Урмас Паэт заявіў, што мэта гэтага кроку — выказаць падтрымку грамадзянскай супольнасці Беларусі, піша БелаПАН.

Падставай для хадайніцтва аб выдачы нацыянальнай візы з'яўляецца кароткатэрміновая праца ў Эстоніі — напрыклад, прадстаўнікоў творчых прафесій, выкладчыкаў, студэнтаў, спартсменаў, трэнераў. Нацыянальную візу таксама можна атрымаць для вучобы, догляду хворага сваяка, для працы нянькай. Доўгатэрміновая віза дае права знаходзіцца на тэрыторыі Эстоніі да 180 дзён на працягу года.

Аналагічнае рашэнне, нагадаем, прынялі Польшча і Латвія.

З-ЗА КРАТАЎ

Анатолю Лябедзьку падоўжылі ўтрыманне пад вартай да 20 мая

Жонка і сын лідара Аб'яднанай грамадзянскай партыі атрымалі ад яго адразу тры лісты, напісаныя 15—17 сакавіка.

Анатоль Лябедзька піша, што мае на руках пастанову аб утрыманні пад вартай да 20 мая і больш ніякай інфармацыі пра сваю будучыню ў яго няма.

"Рэсурс трываласці мой не безразмерны, але дазваляе з усіх сітуацый, што былі і, можа, будуць, выходзіць годна, захоўваючы самапавагу і адданасць сваім жыццёвым прынцыпам", — піша палітык.

У сваіх лістах з-за кратаў Анатоль Лябедзька піша таксама пра побыт у СІЗА, цікавіцца жыццём сына, выказвае пажаданні, а напрыканцы перадае *"найлепшае сардэчнае прывітанне ўсім прыстойным і сумленным людзям"*.

ГУЧНАЯ СПРАВА

У выступленні, якога не было, знайшлі склад злачынства

Былы кандыдат у прэзідэнты ***Дзмітрый Вус*** *накіраваў заяву на імя пракурора Мінска Мікалая Куліка, у якой паскардзіўся на дзеянні следчага Анатоля Сукалы, які вядзе крымінальную справу па падзеях 19 снежня.*

"Абвінавачванне следства не адпавядае ні матэрыялам справы, ні маім фізічным дзеянням", — сказаў Вус у інтэрв'ю БелаПАН. Паводле яго меркавання, дзеянні следчага падпадаюць пад частку 2 артыкула 188 Крымінальнага кодэкса (паклёп, спалучаны з абвінавачваннем ва ўчыненні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства).

"Мяне абвінавачваюць у тым, што, выступаючы на Першым канале тэлебачання і па радыё, я заклікаў выбаршчыкаў прыйсці на плошчу 19 снежня, хоць па радыё я наогул не выступаў", — расказаў Вус.

Ён пачаў ужо знаёміцца з матэрыяламі справы. І даведаўся, што следства выставіла яму абвінавачанне ў арганізацыі масавых беспарадкаў на той падставе, што нібы ў дзень прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня яго 14-гадовы сын Іван падлічыў колькасць міліцэйскіх аўтобусаў, а ён у сваю чаргу быццам бы перадаў гэтыя звесткі Мікалаю Статкевічу.

"Следства таксама абвінавачвае мяне ва "ўпушчаным прыбытку рэстарана "Макдональдс" на суму 8,4 мільёна беларускіх рублёў", — сказаў Дзмітрый Вус.

Аднак, як паведаміў журналістам менеджар па маркетынгу і сувязях з грамадскасцю ЗП "Рэстараны Макдональдс" Артур Юран, ніякіх іскавых патрабаванняў "Макдональдс" Дзмітрыю Вусу не выстаўляў. У кампаніі ўвогуле не ведаюць, хто і як падлічваў гэтыя "недаатрыманыя прыбыткі".

РЭХА 19 СНЕЖНЯ

Мая АБРОМЧЫК:

«Дыягназ мне не гаварылі, каб не пужаць...»

Калі падымалася на пяты паверх "хрушчоўкі", адразу падумала, як кожны дзень па гэтых прыступках з хворай нагой падымаецца 22-гадовая Мая Абромчык: 19 снежня ашалелы амапавец на плошчы Незалежнасці зламаў ёй нагу...

У двухпакаёўцы Мая Абромчык жыве не адна, а яшчэ некалькі студэнтак, былых яе аднагрупніц. Наша размова была не аб хлопцах і новых мадэлях сукенак, а аб пракуратуры, аб бальнічных справах, аб рэабілітацыі...

Нематываваная жорсткасць

— Зараз я жыву з бацькамі ў Ганцавічах, у Мінск прыехала, каб здаць акадэмічную розніцу для пераводу на завочнае, — *распавяла "Народнай Волі" дзяўчына.* — Атрымліваецца, што з-за пералому зімовую сесію на гістфаку БДУ здаць не паспела, прыйшлося пераводзіцца.

— Спецыяльнасць у яе будзе такая ж, як у нас, — *дадала сяброўка Каця, якая выконвала абавязкі гаспадыні, заварваючы гарбату.* — Скончыць наш гістфак у адзін год з намі, ды яшчэ і абавязковага размеркавання пазбегне.

— Але прыйдзецца самастойна шукаць працу, — *уздыхае Мая.* — Хацелася б працаваць па спецыяльнасці, напрыклад, у музеі.

— Выдатніца?

— Не, вучуся не на выдатна, але на бюджэце ў мяне заўжды была стыпендыя.

— Не баішся, што выкладчыкі будуць ставіцца перадузята?

— Магчыма, але будуць і тыя, для каго мая гісторыя будзе нагодай глядзець на мяне цяплей.

— Мая, як ты зараз сябе адчуваеш?

— Усё больш-менш. Кульгаю, нага баліць часам... Урачы кажуць, што аднаўленне пасля такіх пашкоджанняў займае каля года. Ніякай спецыяльнай фізіятэрапіі мне не прызначылі, параілі пабольш хадзіць, павялічваць нагрузку на ногу. Яшчэ раз у месяц хаджу на рэнтген для кантролю.

— Узгадай, калі ласка, вечар 19 снежня...

— Недзе каля паловы на адзінаццатую мы з сябрамі пайшлі на плошчу Незалежнасці. Ішлі, каб паглядзець, што там адбываецца. Калі дайшлі, з боку праспекта было ачапленне, на плошчы знаходзілася не так і многа людзей. Мы і так не збіраліся лезці ў натоўп, а тут яшчэ незнаёмая жанчына папярэдзіла, каб мы сыходзілі хучэй, бо пачаўся "хапун". Было бачна, што амапаўцы пайшлі з двух бакоў — з Валадарскага і ад праспекта Незалежнасці. Яны крычалі нешта кшталту "Зараз мы вам пакажам!", былі вельмі агрэсіўныя. Безумоўна, я не чакала такіх паводзін ад амапаўцаў і, схапіўшы за руку сябра, пабегла за ім прэч. На жаль, спыніліся мы каля глухой сцяны... Як потым мне распавялі сведкі, за намі беглі пяцёра амапаўцаў. Двое пачалі збіваць хлопца і дзяўчыну, якія выбеглі там жа, іншыя заняліся намі. Адзін пачаў збіваць майго сябра Андрэя. Пры гэтым ніякіх патрабаванняў яны нам не выстаўлялі. Я разгубілася, пачала прасіць, каб амапавец перастаў збіваць, — звярнулася да яго як да звычайнага, нармальнага чалавека. Ніколі б не падумала, што прафесія так мяняе людзей! Замест таго каб спыніцца, ён збіў мяне... Потым нас пачалі гнаць у аўтобус. Ісці сама я не змагла, мой сябра Андрэй, сам збіты, панёс мяне на руках. Амапаўцы ўвесь час крычалі, панукавалі... У аўтобусе нас перадалі на рукі міліцыі. Я адразу зразумела, што ў меня зламана нага. Пажылая жанчына, якая была побач, пачала патрабаваць, каб мне выклікалі "хуткую". Паступова да яе далучыліся ўсе "пасажыры" аўтобуса. Спачатку міліцыянеры ніяк не рэагавалі, потым пачалі казаць, што я хлушу. Мне так і не дапамаглі. Мы паехалі, кружылі, недзе спыняліся, стаялі. Я дрэнна гэта памятаю, бо амаль згубіла прытомнасць. Потым мне сказалі, каб я выходзіла з аўтобуса. Нягледзячы на тое што ісці сама я не магла, мне ніхто не дапамог: ні міліцыянты, ні ўрач "хуткай", якой мяне перадалі. Да машыны я кульгала на адной назе... Урач нават не дапамагла зняць абутак, хаця рабіць гэта самой мне было надзвычай балюча. Аглядала мяне жанчына сярэдніх гадоў, звярталася даволі груба. Пазней, у шостай бальніцы, мне далі абязбольваючае і наклалі жгут. Урач сказала, што яна не траўматолаг і не можа дыягнаставаць пералом, хаця тое, што нага зламана, было відавочна нават мне. Ад гэтага рашэння залежала, адправяць мяне ў шпіталь ці не. Калі прыехаў траўматолаг, то ён па адным апісанні сказаў, што ў мяне пералом і мяне трэба шпіталізаваць.

У другой бальніцы, куды мяне прывезлі ў стацыянар, зрабілі здымкі, наклалі гіпс і адразу паведамілі, што патрэбна аперацыя. Дыягназ не гаварылі, напэўна, каб не палохаць. Я зразумела, што нешта не так, бо, калі ўрачы глядзелі на здымак, выразы іх твараў мяняліся...

Аперацыю зрабілі хутка, сказалі, што пашанцавала. Маўляў, некаторым прыходзіцца чакаць некалькі дзён. Урачам трэба было склаці аскепкі косці і замацаваць іх на штыфтах. Дзякуючы гэтай канструкцыі можна было абысціся без гіпсу.

— Доўга знаходзілася ў бальніцы?

— Мяне выпісалі праз тыдзень. Хаця я была вельмі слабай, мне цяжка было дабрацца дахаты. У Ганцавічах адразу цяжка захварэла, была вельмі высокая тэмпература, мяне ванітавала...

— Калі змагла паведаміць бацькам і знаёмым, што здарылася няшчасце?

— Бацькам я распавяла раніцай 20 снежня. Сваім сябрам пісала СМСкі адразу пасля затрымання. Званіць забаранялі міліцыянеры.

— Калі ішла на плошчу, на адзенні былі якія-небудзь значкі, сімволіка?

— Мы з сябрамі былі апрануты ў звычайнае цывільнае адзенне. Ніякай сімволікі, нічога вызначальнага.

(Анты)гуманны суд

— Думала, што 19 сакавіка пачнецца суд па маёй скарзе, накіраванай у пракуратуру, — *працягвае свой аповед Мая.* — Дарэмна, як аказалася... Калі я прыйшла да пракурора, ён паведаміў, што папярэдняе расследаванне будзе працягнута яшчэ на месяц. Чаму? Ён толькі сказаў, што гэта "пастанова зверху"...

— Сама дадумалася напісаць скаргу альбо нехта падказаў?

— Безумоўна, мне і маім бацькам хацелася знайсці вінаватых. Шмат хто падтрымліваў наша рашэнне, але знаходзіліся і тыя, хто раіў суцішыцца, праглынуць тое, што здарылася. Спачатку я напісала скаргу ў пракуратуру, яе перанакіравалі ў міліцыю і дадалі да справы аб масавых беспарадках. Потым яе зноў перакінулі ў пракуратуру, матывуючы тым, што скарга ў дачыненні да двух нявыяўленых супрацоўнікаў АМАПа ніякага дачынення да падзей на плошчы не мае. Потым мяне дапыталі і накіравалі на судмедэкспертызу. Як мне патлумачылі пазней, судмедэкспертыза была проста сродкам адцягнуць пачатак справы, бо пры маіх пашкоджаннях дастаткова заключэння з бальніцы. Тым не менш я прайшла ўсе працэдуры. Гэта было каля тыдня таму, бо ўрач хварэла, з'язджала... Між тым яна ўстанавіла, што ступень майго пашкоджання — цяжкая, пералом быў нанесены пры дапамозе тупога прадмета і ім магла быць міліцэйская дубінка. Нават за адзін удар мне маглі зламаць нагу. Таксама засведчылі, што, калі мяне даставілі ў бальніцу, я не знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення.

Зараз мы будзем пісаць скаргу ў Генпракуратуру аб беспадстаўным зацягванні справы.

— А што за гісторыя з адвакатамі? Скардзіліся на тое, што ніхто не хоча па тваёй справе працаваць?

— Мая маці шукала адваката ў прыватных юрыдычных канторах Мінска, але тамтэйшыя праваабаронцы вельмі скептычна ставіліся да маёй справы. Было бачна, што яны баяліся. Толькі з трэцім адвакатам праца больш-менш пачалася...

— Рашучасць яшчэ не вычарпана?

— Я буду ісці да канца. Хаця не надта веру ў поспех. Зараз нават не вельмі верыцца ў тое, што завядуць крымінальную справу...

— Чаму? Кажуць, што людзей, якія вас збівалі, знайшлі.

— Знойдзены тыя, хто распісаўся ў пратаколе затрымання майго сябра Андрэя, з якім нас збівалі разам. Тэарэтычна гэта маглі быць і яны. Аднак як мог адзін і той жа супрацоўнік АМАПа ў адзін час затрымаць 16 чалавек? Хаця, думаю, няблага было б і гэтых людзей прыцягнуць да адказнасці.

— Зараз змагла б апазнаць тых, хто затрымліваў і збіваў?

— Прайшло ўжо даволі шмат часу, але аднаго дакладна пазнала б. Я нават намагалася зрабіць нешта кшталту фотаробата...

— Пасля скаргаў не было ніякага ціску з боку праваахоўных органаў?

— Пасля аперацыі да мяне ў шпіталь прыйшлі два чалавекі. Яны назваліся следчымі, хаця іх пасведчанні добра разглядзець так і не паспела. Яны ўзялі ў мяне так званую "тлумачальную". Нічога такога не пыталі, толькі, як я апынулася на Плошчы, з кім была, што рабілі, ці не размаўлялі па-беларуску... Адказала, што мне проста было цікава паназіраць. Больш ад іх ні слыху ні дыху.

— Перажыўшы ўсё, што было з табой, яшчэ раз выйшла б на Плошчу?

— Мне, вядома, хочацца нешта рабіць, як-небудзь палепшыць сітуацыю ў краіне...

Мне хацелася б...

— Як бавіла час, пакуль ляжала ў шпіталі?

— Да мяне прыходзіла шмат розных людзей. Знаёмыя і незнаёмыя. А яшчэ бывала такое, што каталіся па калідоры на калясцы. Мяне вельмі маральна падтрымлівалі візіты людзей. Было шмат мяккіх цацак, кветак... Гэта дапамагло мне зноў паверыць у людзей...

— Нейкія новыя цікавыя знаёмствы завяліся?

— Няшмат, бо тады я была ў такім стане, што размаўляць было цяжка. Таксама, як і ўставаць з ложка.

— Малады чалавек ёсць?

— Не, пакуль я адна...

— Будуеш планы на будучае? Адпачынак, падарожжа...

— Пакуль яшчэ шмат няяснага ў маім жыцці. Буду чакаць суда і другой аперацыі...

— Не думала паехаць лячыцца за мяжу?

— Мне падаецца, што гэта было б добра. Тым больш я яшчэ ніводнага разу не была за мяжою. Але зараз я хачу давесці да канца ўсе свае справы. Мне б хацелася, каб няшчырыя людзі ў АМАПе і міліцыі задумаліся аб тым, што яны робяць.

— Вучыцца за мяжой хацелася б?

— Я ведаю, што ў Еўропе добрая адукацыя, але пакуль не скончу сваю справу, не варта аб гэтым і думаць. Тым больш, трэба будзе чакаць, ці будзе на мяне ціск, ці ўвогуле дойдзе справа да суда. І ўніверсітэт, безумоўна, трэба скончыць...

Марыя МАЛЕВІЧ.

ТЫМ ЧАСАМ

Лячэнне Маі Абромчык можа працягнуцца за мяжою

Дапамагчы дзяўчыне зрабіць паўторную аперацыю на назе за мяжою адклікнуліся актывісты грамадзянскай кампаніі "Гавары праўду!".

Мэта акцыі — паведаміць аб справах Маі замежным клінікам і накіраваць дзяўчыну на лячэнне. Рэабілітацыя Маі Абромчык зойме не менш за год і будзе даволі складанай. Аб гэтым ведае і сама студэнтка, і ўсе, каго закранула яе трагедыя. Зараз адкрыты рахункі, на якія любы жадаючы можа пералічыць грошы на дапамогу дзяўчыне. Менавіта за гэтыя дабрачынныя сродкі Мая аплачвае паслугі адваката.

ПАЛІТКУХНЯ

...Яны ў турме, а гэты здраднік раз'язджае па канферэнцыях

Як паведаміла "Еўрарадыё", Артур Папок, былы актывіст штаба кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева і кіроўца мікрааўтобуса, атакаванага 19 снежня ў Мінску невядомымі, спрабаваў на міжнароднай канферэнцыі ў Варшаве сарваць выступленне Раманчука. Яшчэ да пачатку канферэнцыі ён раздаваў прысутным англамоўныя ўлёткі з рэзкай ацэнкай дзеянняў Яраслава Раманчука пасля выбараў. Як вядома, раніцай 20 снежня Раманчук зачытаў заяву з крытыкай іншых апазіцыйных кандыдатаў, а таксама журналісткі Ірыны Халіп, якія на той час ужо былі затрыманыя. Падчас выступлення Раманчука Папок падышоў да яго і выказаў па-англійску на яго адрас словы ганьбы.

Зміцер Бародка, былы сябра штаба экс-кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава, пацікавіўся ў Раманчука, "ці ёсць у яго сумленне". Яраслаў Раманчук сказаў, што сумленне мае, што нікога не падманваў. *"А калі трэба выбраць паміж жыццём людзей і палітычнай кар'ерай, то я выбраў першае"*.

Усё гэта адбылося падчас абмеркавання палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў Беларусі.

Нагадаем, што канферэнцыя арганізавана Польскім інстытутам міжнародных спраў і амбасадай Брытаніі ў Польшчы. Напярэдадні складам беларусаў, якіх запрасілі абмеркаваць лёс дэмакратыі, абурыўся старшыня Вярхоўнага Савета 12-га склікання Станіслаў Шушкевіч.

"Я пра такіх, з дазволу сказаць, "палітыкаў", як Раманчук, наогул гаварыць не хачу. Баязлівец і здраднік, не кажучы ўжо пра тое, што непісьменны эканаміст. Ягонае шчасце, што я не заўважыў, што ён ехаў са мной на днях у адным вагоне ў Вільню, інакш бы абавязкова плюнуў бы яму ў твар. Здрадзіць усім, уключаючы свайго кіраўніка Анатоля Лябедзьку, шэфу партыі, узвесці паклёп на кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава і ягоную жонку Ірыну Халіп... І зараз яны ў турме, а гэты здраднік раз'язджае па канферэнцыях. Яму каяцца трэба за тое, што ён зрабіў, усё жыццё!" — заявіў Шушкевіч сайту Хартыя'97.

Дасталося ад Станіслава Станіслававіча і другому ўдзельніку ад беларускага дэмакратычнага лагера — Аляксандру Мілінкевічу.

"Шкадую, што арганізатары не разабраліся, з кім маюць справу. Мілінкевіч зруйнаваў Партыю БНФ, а пасля АГП, працуе як "падсадная качка" Лукашэнкі са сваімі прапановамі ўпісацца ў дыктатуру, толькі б нічога ў краіне не змяняць. Як можна было запрашаць такіх людзей абмяркоўваць такія важныя пытанні? Гэта амаральна і абразліва для беларускага народа", — заявіў Станіслаў Шушкевіч.

СЛЫШАЛИ?

Появится еще один промышленный холдинг

Белорусские власти пытаются спасти промышленность старым методом, перенесенным из сельского хозяйства: укрупнением предприятий. Министерство промышленности Беларуси готовит проект государственного решения о создании в республике холдинговой структуры, объединяющей предприятия станкоинструментальной промышленности, сообщили агентству "Интерфакс-Запад" в Минпроме.

По информации представителя министерства, такое решение было озвучено министром промышленности Беларуси Дмитрием Катериничем в ходе недавнего совещания на ОАО "Станкостроительный завод "Красный борец" в Орше. *"Министром было дано поручение отраслевому управлению — это управление машиностроения и металлургии Минпрома — подготовить проект государственного решения о создании в Беларуси холдинга в станкоинструментальной промышленности. С учетом выполнения всех процедур такой холдинг может быть создан до конца текущего года"*, — сообщил представитель Минпрома.

В холдинг планируется включить 22 предприятия станкостроения и инструментальной промышленности, а также некоторые предприятия электронной промышленности. Предполагается, что управляющей компанией холдинга может стать Минский станкоинструментальный завод "МЗОР". К настоящему времени практически все предприятия, которые планируется включить в холдинг, уже акционированы, таким образом, подготовительная работа во многом выполнена, добавил представитель Минпрома.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—28 САКАВІКА 2011 г.

ПА ВАШАЙ ПРОСЬБЕ

Шаноўная рэдакцыя! Нагадайце хаця б коратка гісторыю стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года.

Сяргей ЗАДАРОЖНЫ, жыхар Гродна.

Так паўставала Беларуская Народная Рэспубліка

Савецкія, ды і некаторыя сённяшнія гісторыкі і прапагандысты лічылі і лічаць Беларускую Народную Рэспубліку нейкім штучным утварэннем, незразумелай непатрэбнасцю. Яны ўпарта ігнаруюць неабвержны факт, што ідэя свабоды Бацькаўшчыны, яе незалежнасці вынашана, выпакутавана многімі пакаленнямі нашых продкаў, якія гераічна змагаліся за вольную Беларусь.

Зазірнём у хроніку падзей напярэдадні і падчас абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

1915 г. У Вільні ўтвараецца агульнанацыянальны канспіратыўны орган — Беларускі народны камітэт. Яго чальцы — вядомыя дзеячы беларускага руху браты **Луцкевічы**, браты **Станкевічы**, паэтка **Канстанцыя Буйло**, пісьменнік **Максім Гарэцкі**.

Вацлаў Ластоўскі першым сярод тагачасных беларускіх палітычных лідараў выказвае ідэю поўнай незалежнасці Беларусі.

1916 г. Упершыню на міжнародным узроўні на канферэнцыях народаў Расіі ў Стакгольме (красавік) і Лазане (чэрвень) віленскія нацыянальныя дзеячы, прадстаўляючы Беларусь, паставілі пытанне пра будучую палітычную самастойнасць краіны і выказалі рашучае жаданне пазбавіцца ад прыгнёту расійскіх улад.

1917 г. 15 снежня дзеля рашэння лёсу Беларусі сабраўся прадстаўнічы Усебеларускі з'езд. У ноч з 17 на 18 снежня, калі дэлегаты прыступілі да пытання аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай рэспублікі, бальшавіцкі савет народных камісараў Заходняй вобласці (у складзе Савецкай Расіі) на чале з Карлам Ландарам дае каманду гвалтоўна разагнаць з'езд сіламі вайскоўцаў. Прэзідыум з'езда на чале з **Іванам Серадой** быў арыштаваны, але нават пад прыцэламі браневікоў дэлегаты паспелі прыняць рэзалюцыю пратэсту супраць дзеянняў кіраўніцтва Заходняй вобласці і аб непрызнанні яго ўлады, фактычна дэкларавуўшы ідэю Беларускай Народнай Рэспублікі.

Выбраная на Усебеларускім з'езідзе Рада (Усебеларускі савет) на чале з **Язэпам Лёсікам,** перайшоўшы на нелегальнае становішча, стала юрыдычнай пераемніцай усёй паўнаты ўлады ад разагнанага з'езда. На чале Выканаўчага камітэта Рады стаў **Язэп Варонка.**

1918 г. 19 лютага — уцёкі бальшавікоў з Мінска пры наступленні немцаў па ўсім Усходнім фронце ў выніку зрыву савецкай дэлегацыяй Брэсцкіх перамоў. Выйшаўшы з падполля, Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда абвяшчае сябе найвышэйшай уладай у Беларусі і вылучае са свайго складу першы беларускі ўрад — **Народны Сакратарыят Беларусі** на чале з **Язэпам Варонкам.** Усё гэта адзначана ў **Першай устаўнай грамаце да народаў Беларусі,** апублікаванай 21 лютага 1918 года.

9 сакавіка Выканкам Рады Усебеларускага з'езда ў адказ на ганебны Брэсцкі мір, які дзяліў Беларусь між Расіяй і Германіяй (расійскія бальшавікі-ленінцы, як і царскія самадзержцы, лічылі нашы землі неад'емнай часткай сваёй імперыі), выдае **Другую ўстаўную грамату**, якая з'яўляецца канстытуцыйнай. У ёй прама гаворыцца пра **ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі** ў межах рассялення і колькаснай перавагі беларусаў. Заканадаўчую ўладу атрымлівае Рада (старшыня — **Іван Серада**), выканаўчую — Народны сакратарыят. Канчатковае рашэнне аб уладзе перакладалася на ўстаноўчы сейм, які павінны быў быць абраны шляхам свабодных выбараў. У Грамаце сцвярджаюцца дэмакратычныя прынцыпы, шануюцца правы нацыянальных меншасцяў, зямля перадаецца тым, хто на ёй працуе, уводзіцца 8-гадзінны рабочы дзень. Па сваім дэмакратызме Грамата была вышэй за Канстытуцыю Савецкай Расіі 1918 года. У БНР ніхто не пазбаўляўся права выбіраць і быць выбраным, забаранялася вайна супраць рэлігіі і ўсялякая цэнзура. Менавіта абраннікі беларускага народа фарміравалі свае дзяржаўныя структуры, немцы-акупанты да гэтага ніякага дачынення не мелі.

...А 8-й гадзіне вечара 24 сакавіка на пасяджэнні Рады фракцыя Беларускай сацыялістычнай грамады ўнесла прапанову аб абвяшчэнні незалежнасці БНР. Спавешчанне пра неабходнасць дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі зрабіў кіраўнік фракцыі **Аркадзь Смоліч**. Наступнай раніцай а 6-й гадзіне — **25 САКАВІКА 1918 ГОДА — рэзалюцыя аб незалежнасці была прынята!** Пасля грунтоўнага артыкульнага абмеркавання ў гэты ж дзень была зацверджана **Трэцяя ўстаўная грамата да народаў Беларусі**.

Гэтым гістарычным актам Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай дзяржавай, а Брэсцкі мірны дагавор скасоўваўся. Спрадвечная мара беларускіх барацьбітоў за сваю незалежную краіну насуперак планам і волі магутных дзяржаў пачала здзяйсняцца. І з гэтым ужо не маглі не лічыцца ворагі нашай дзяржаўнасці.

Праіснаваўшы ўсяго некалькі месяцаў у найцяжэйшых умовах нямецкай акупацыі, задушаная бальшавікамі з захопам Мінска Чырвонай Арміяй у снежні 1918 года, БНР тым не менш пакінула магутны след у нашай гісторыі і свядомасці, стала сімвалам нацыянальнай незалежнасці беларусаў, поклічам да вольнай, светлай будучыні роднай зямлі. Цяжка пераацаніць у гістарычным плане здзейсненае стваральнікамі БНР за гэтыя кароткія месяцы. Сам факт існавання беларускай дзяржавы садзейнічаў самасцвярджэнню нацыі. БНР выдала сваім грамадзянам нацыянальныя пашпарты, зацвердзіла нацыянальную сімволіку — дзяржаўны герб "Пагоню" і бел-чырвона-белы сцяг. Беларуская мова стала дзяржаўнай і абавязковай для грамадзян. У 1918 годзе па-беларуску выходзілі шэсць газет і тры часопісы, працавалі 11 выдавецтваў. Урад БНР арганізаваў збор ахвяраванняў на развіццё асветы. У школы прыйшла беларуская мова, ствараліся школы для насельнікаў іншых нацыянальнасцяў. Цэнтрам культурнага жыцця ў Мінску стаў Беларускі народны дом імя Максіма Багдановіча. Адчыніліся Беларускі педагагічны інстытут, кансерваторыя, дзяржаўны тэатр... Але ажыццявіць вялікія планы па адраджэнні Бацькаўшчыны тады не ўдалося — яны не ўпісваліся ў планы Масквы...

І ўсё ж праз упартае змаганне, безліч ахвяр і пакут на цярністым шляху высакародныя ідэі Беларускай Народнай Рэспублікі прараслі абвяшчэннем незалежнай Рэспублікі Беларусь ужо ў найноўшы час у 1991 годзе.

ЧЫТАЧ—ГАЗЕТА

На памежжы з крывадушшам

У апошні перыяд у Беларусі сфарміраваўся пласт нацыянальнай арыстакратыі, які здраджвае мове. Сямён Букчын, Лёў Марголін, Барыс Жаліба, журналісты Валерый Карбалевіч, Алена Малочка — гэта людзі, якія добра ведаюць мову, але ў сілу абставін пішуць свае артыкулы па-расійску. Здрада беларускай мове — гэта памежжа з крывадушшам. Як можна пісаць пра Алеся Пушкіна ці пра Плошчу па-расійску?! Хіба немцы пішуць пра свае праблемы па-расійску, французы — па-ўкраінску, а англічане — на мове ангелаў?

Браткі-журналісты і палітыкі, рамантыкі і прагматыкі, пішыце па-беларуску, "каб не ўмёрлі".

Алесь ВАЛАСЮК.

Віцебск.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

Каму на карысць Беларуская АЭС

У гэтыя дні ўвага ўсяго свету прыкавана да падзей у далёкай Японіі. Яшчэ раз мы сталі сведкамі таго, як разгул неўтаймаванай прыроднай стыхіі прыводзіць да гібелі тысяч людзей і вялікіх па маштабе разбурэнняў.

Але ж трэба: якраз у гэтыя дні ў Мінску было падпісана пагадненне паміж Беларуссю і Расіяй аб будаўніцтве Беларускай атамнай электрастанцыі. Здавалася б, страшныя і трагічныя падзеі ў Японіі (высяленне дзясяткаў тысяч людзей, радыяцыйнае забруджванне вялікай тэрыторыі з усімі негатыўнымі наступствамі) павінны былі вярнуць беларускую ўладу да рэальнасці і пераканаць у тым, што не варта сваімі рукамі закладваць пад краіну бомбу ў выглядзе АЭС. Тым больш што горкі вопыт Японіі засведчыў, што і праз 25 год пасля Чарнобыля чалавецтва ўсё яшчэ не мае дзейсных сродкаў для прадухілення радыяцыйнага забруджвання.

Каб неяк заглушыць чарнобыльскі рэактар, дзень і ноч над ім віселі верталёты, пілоты якіх сваімі жыццямі заплацілі за наша выратаванне. А ў Японіі забаранілі ўсе палёты над АЭС адразу пасля таго, як стала вядома, што радыяцыйны фон перавышае дапушчальныя нормы. І насельніцтва Краіны ўзыходзячага сонца аператыўна і праўдзіва інфармуецца аб стане рэчаў.

Калі ж уявіць (зноў, канечне, не дай Божа) падобную сітуацыю на будучай АЭС пад Астраўцом, то душа заходзіцца. Дзе і калі хоць адзін дыктатарскі рэжым казаў праўду людзям? У Беларусі нават інфармацыю пра колькасць захварэўшых на грып хаваюць, як звышсакрэтную тайну! Пра варты жалю стан нашай медыцыны і выратавальных служб і казаць не трэба. У нас жа ў першую чаргу, па зразумелых прычынах, фінансуюцца зусім не патрэбы насельніцтва.

Чаму, напрыклад, на Гомельшчыне, якая найбольш пацярпела ад Чарнобыля, няма ў свабодным продажы дазіметраў ці іншых прыбораў для кантролю за радыяцыйным фонам? Чаму ўлады ўпарта не жадаюць прызнаваць, што цяжкія захворванні ліквідатараў выкліканы іх знаходжаннем у зоне радыяцыйнага забруджвання? Чаму вяртаюць у сельскагаспадарчае выкарыстанне забруджаныя землі? І такіх пытанняў можна задаваць вельмі і вельмі шмат.

А адказ будзе адзін — рэжым, які пануе ў Беларусі, не лічыць жыццё і здароўе грамадзян вышэйшай каштоўнасцю... Калі ж дадаць сюды ўсе астатнія мінусы будучай АЭС — эканамічныя, сацыяльныя, экалагічныя, пра якія "Народная Воля" ўжо не раз пісала, то стане канчаткова зразумела, што будаваць АЭС у Беларусі — зусім не на карысць народу. Тым больш нельга выпускаць з поля зроку яшчэ адну, найважнейшую рэч: гэты амбітны для ўлады праект намёртва прывязвае Беларусь да Расіі, вядзе да згубы нашай незалежнасці.

З павагай —

Дзяніс РАБЯНОК, грамадскі актывіст.

г.Калінкавічы.

Лечкамісію — для ўсіх!

Некалькі разоў бываў у Рэспубліканскім клінічным медыцынскім цэнтры Кіраўніцтва справамі прэзідэнта (так званая лечкамісія). У палатах — прыбіральня, тэлевізар, душ! Лячэбніца для князёў!

На мой погляд, лечкамісія павінна быць адкрытай для ўсіх, а не толькі для чыноўнікаў. Альбо такія ўмовы, як там, павінны быць створаны ва ўсіх клініках Беларусі.

Сяргей НОРМАН, літаратар.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Які новы цэнтр па кансалідацыі апазіцыі стварае Мілінкевіч?

Днямі краем вуха пачуў, што лідар грамадскага руху "За Свабоду" выступіў з ініцыятывай стварэння нейкага новага цэнтра па кансалідацыі апазіцыі. Патлумачце, калі ласка, што гэта за структура? Як яна будзе працаваць, якія сілы аб'ядноўваць? І хто з беларускіх палітыкаў падтрымаў ужо ініцыятыву Мілінкевіча?

Ігар ПАЛЬЧЭВІЧ, Мінскі раён.

Лідар руху "За Свабоду" **Аляксандр Мілінкевіч** цяпер знаходзіцца ў Польшчы, таму "Народная Воля" папрасіла адказаць на гэтае пытанне ягонага намесніка **Юрася Губарэвіча.**

— Не маецца на ўвазе стварэнне нейкай новай структуры альбо кааліцыі, — *адразу падкрэсліў палітык.* — Гаворка ідзе толькі пра кансалідацыю дэмакратычных сіл з мэтай выпрацоўкі і наступнага прыняцця адзінай стратэгіі дзеяння. Гэтая кансалідацыя можа адбывацца шляхам перамоў, нейкіх супольных пасяджэнняў супольных груп і гэтак далей. Карацей, гэта хутчэй працэс, чым новая структура.

— Маюцца на ўвазе перамовы з уладамі ці паміж самой апазіцыяй?

— У першую чаргу паміж апазіцыяй, каб прыйсці да нейкай супольнай думкі, а пасля ўжо могуць быць перамовы і з уладай, калі ўсе пагодзяцца менавіта на такі варыянт. Але перамовы з уладай — не самамэта. Галоўная задача — дасягненне згоды ў беларускім грамадстве і перамены, якія даўно наспелі ў грамадстве. Думаю, з боку ўлады таксама ёсць адчуванне, што сітуацыя ў Беларусі цяпер не самая лепшая і яе трэба мяняць.

— Цікава, нехта ўжо адгукнуўся на ініцыятыву Мілінкевіча?

— Працэс перамоўны ідзе, прычым дастаткова шырока, з удзелам прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і арганізацый, якія ўваходзяць у Нацыянальную платформу форуму "Усходняе партнёрства". Таксама ў гэтым працэсе бяруць удзел структуры кааліцыі "Беларускі выбар" (Беларуская партыя "Зялёныя", аргкамітэт па стварэнні Партыі свабоды і прагрэсу, Партыя БНФ і інш.). Прадстаўніцтва даволі шырокае. Наколькі я ведаю, вышэйпералічаныя арганізацыі ўжо вядуць канкрэтную працу. Таксама аб сваім намеры далучыцца выказваюцца іншыя арганізацыі, якія ўваходзяць у Каардынацыйную раду дэмакратычных сіл.

— Але літаральна на пачатку студзеня прадстаўнікі беларускай апазіцыі падпісаліся пад адмысловай дэкларацыяй. Яны разам збіраліся дабівацца вызвалення палітвязняў, спынення вобыскаў, абяцалі ладзіць сумесныя інфармацыйныя кампаніі і сумесна рыхтавацца да выбараў. Калі апазіцыя можа аб'яднацца вакол гэтых пунктаў, навошта патрэбны нейкі новы кансалідаваны цэнтр?

— Дэкларацыя не прадугледжвае нейкіх далейшых крокаў дзеля змены сітуацыі. Неабходна выпрацоўваць супольную стратэгію. І заклік Мілінкевіча — гэта заклік да яднання, да супольнай пазіцыі, да агульнага пункту гледжання. А не да стварэння новай структуры...

Марына КОКТЫШ.

ХТО — КАМУ

З чые кішэні грошы за газ?

За мінулыя пяць гадоў кошт на імпартны газ павялічыўся ў пяць разоў. У інтарэсах грамадзян дзяржава (так падносяць нам улады) асноўны фінансавы цяжар па пакрыцці затрат пераклала на плечы рэальнага сектара эканомікі. А па якіх тарыфах разлічваюцца за газ індывідуальныя спажыўцы? Наколькі рэальна даціруе іх дзяржава і якія расходы яны пакрываюць самі?..

Пётр Музычэнка, служачы.

У 2011 годзе Беларусь вымушана купляць расійскі газ у сярэднім па 230 долараў за тысячу кубаметраў. Гэта на 20 працэнтаў вышэй, чым было летась. Але і такі кошт для эканомікі цалкам здавальняючы, асабліва беручы пад увагу тыя тарыфы, што існуюць для заходнееўрапейцаў.

Тым не менш з лютага кошт газу для беларускіх прадпрыемстваў павялічаны на 25 працэнтаў. Як гэта адаб'ецца на кішэні простых грамадзян? Ды вельмі проста: прыкладна на тыя ж 25 працэнтаў узрастуць затраты прамысловасці па вырабе тавараў, прадастаўленні паслуг і г.д. А кампенсаваць павышэнне "газавых" затрат вымушаны будзем мы — насельніцтва, купляючы тавары і аплачваючы паслугі. Напрыклад, паслугі таго ж ЖКГ...

Пакуль што нам кажуць: выплаты спажыўцоў за газ (па лініі ЖКГ) не перавышаюць 30 працэнтаў ад таго, што прыходзіцца плаціць за яго жыллёва-камунальнай гаспадарцы. З часам паступова (так нам абяцаюць) прыйдзецца выплачваць 60 працэнтаў рэальнага кошту, а затым і ўсе 100. І ад гэтага нікуды не падзецца, бо эканамічныя законы ніхто не адмяняў. Але ж мусяць быць механізмы стрымлівання, кампенсацый, гібкай палітыкі ў балючай для насельніцтва сферы. Людзі павінны рэальна ацэньваць і прадбачыць, што іх чакае праз месяц, паўгода, год.

Пакуль сітуацыя такая, што прагнозы і абяцанні мала стасуюцца з рэальнасцю. Абяцалі, што гадавы рост тарыфаў на паслугі ЖКГ не перавысіць 5 долараў у эквіваленце, але ўжо сёння відавочна, што такі сцэнарый нерэальны. Лютаўскі скачок цэн на тарыфы балюча ўдарыў па кішэні спажыўцоў, асабліва малазабяспечаных грамадзян. **Адна справа 219 рублёў за куб газу, як было яшчэ зусім нядаўна, і зусім іншая — 307,7 рубля, а ўлетку — усе 848,7 рубля.** Тут не тое што пачухаеш патыліцу — завыеш... Дык пра які "калідор" у 5 долараў можна гаварыць?!..

Вось некаторыя разлікі. Калі зыходзіць з кошту кубаметра газу 307,7 рубля, то за 1000 кубоў індывідуальны спажывец ужо ў сакавіку павінен выкласці 307.700 рублёў, лічы, 101,8 долара. Пры такім раскладзе насельніцтва акупляе расходы дзяржавы на набыццё газу ў Расіі ўжо больш як на 40 працэнтаў.

Цяпер возьмем другі варыянт, летні. За 1000 кубаметраў газу спажыўцы будуць выкладваць 848.700 рублёў, а гэта ўжо па курсу Нацбанка прыкладна 281 долар. Атрымліваецца, што ў летні перыяд ужо насельніцтва будзе даціраваць дзяржаву. На кожнай тысячы кубоў яна "нагрэе рукі" больш як на 50 долараў.

Вось і атрымліваецца, што ў канечным выніку за ўсё разлічваецца не столькі "рэальны сектар эканомікі", колькі рэальны Іван Пятровіч ды Мар'я Сцяпанаўна...

Георгій ЧЫГІР.

Калі спросціцца праезд у Польшчу?

Чакаецца, што ў красавіку ўступіць у сілу так званае Пагадненне паміж Польшчай і Рэспублікай Беларусь аб малым памежным руху.

Калі час "х" надыдзе, то значна спросціцца перасячэнне мяжы для людзей, што стала пражываюць у зоне па абодва бакі дзяржаўнай мяжы. У зону дзеяння Пагаднення трапляюць больш за мільён чалавек. З боку Беларусі ў зону ўвайшлі такія буйныя гарады, як Брэст і Гродна, а з польскага — населеныя пункты кшталту Гайнуўкі, Аўгустова, Суколкі...

Па словах Генеральнага консула Генеральнага консульства Рэспублікі Польшча Анджэя Хадкевіча, у Генконсульстве чакаюць значнага прытоку наведвальнікаў. І таму плануецца актывізаваць работу з наведвальнікамі, павялічыць колькасць "вокнаў" для прыёму дакументаў. Людзям будуць выдаваць пасведчанні ўдзельніка памежнага руху. Гэта будзе пластыкавая картка, аналагічная той, што вось ужо два гады выдаецца памежным жыхарам з Украіны. Працэдура зойме прыкладна два месяцы, бо дакумент друкуецца ў друкарні каштоўных папер. У астатнім сістэма выдачы пасведчання досыць ліберальная. Адзіная падстава адмовіць у атрыманні карткі — пошук работы за мяжою.

Парламенты Польшчы і Беларусі ўжо ратыфікавалі Пагадненне аб малым памежным руху. Яшчэ восенню. Паставіў свой подпіс пад дакументам і прэзідэнт Польшчы Браніслаў Камароўскі. Засталося, каб ратыфікаваны дакумент, падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам, перадалі ў МЗС Польшчы. Тады праз 30 дзён Пагадненне ўступіць у сілу. Але пакуль што беларускі бок гэты крок не зрабіў...

Георгій ПЛАТОНАЎ.

ХАЧУ ВЕДАЦЬ...

Ці падкручваць гадзіннік

Нешта я не магу знайсці ў "Народнай Волі" адказу на пытанне, ці будзем мы ў далейшым пераходзіць на зімовы час. Альбо Беларусь адмовіцца ад пераводу стрэлак гадзіннікаў следам за Расіяй?

Сяргей Рамейка, Мінск.

Пытанне пра магчымасць адмены ў Беларусі сезонных пераводаў стрэлак гадзінніка будзе разгледжана не раней за лета 2011 года. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Сяргей Іўлеў.

"Мы яшчэ будзем дадаткова вывучаць думкі міністэрстваў і ведамстваў адносна таго, ці пераходзіць увосень 2011 года на зімовы час", — адзначыў Сяргей Іўлеў.

Працэдура пераводу стрэлак у Беларусі як незалежнай дзяржаве ажыццяўляецца з 1996 года ў адпаведнасці з рашэннем урада. Гэта пераход на летні і зімовы час вясной (у апошнюю нядзелю сакавіка) і восенню (у апошнюю нядзелю кастрычніка). *"Мы ажыццяўляем такі пераход для таго, каб карэспандзіраваць яго з суседнімі краінамі, дзе таксама пераводзяць стрэлкі гадзінніка,* — адзначыў намеснік старшыні Дзяржстандарта. — *Каб мы жылі ў прасторы, дзе скаардынаваны часавыя пераходы".*

Яшчэ адзін аргумент за перавод стрэлак на летні і зімовы час — магчымасць у большай ступені выкарыстоўваць светлы час сутак для актыўнай дзейнасці чалавека. Важнай і значнай прычынай тут таксама з'яўляецца эканомія электраэнергіі. Калі зрушваецца час, забяспечваецца магчымасць меншага выкарыстання электраэнергіі ў светлы час сутак.

Цяпер больш за 80 краін свету робяць такі пераход, хоць ёсць і такія дзяржавы, якія гэтага не прытрымліваюцца. Так, краіны ЕўрАзЭС Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан не пераводзяць стрэлкі гадзіннікаў на летні і зімовы час.

"Мы абмяркоўваем аргументы, фактары, пераводзіць ці не стрэлкі гадзінніка", — канстатаваў Сяргей Іўлеў. Калі ў Расіі прымуць рашэнне ўвосень не пераходзіць на зімовы час, то Беларусь застанецца фармальна адзінай краінай у ЕўрАзЭС, у Мытным саюзе, дзе такі працэс будзе захоўвацца. *"Але Расія — наш сусед, і мы б хацелі захаваць тое становішча, калі суседні часавы пояс адрозніваецца на адну гадзіну, не больш",* — адзначыў намеснік старшыні Дзяржстандарта.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Два мільёны ў белым канверце

Аліна Сяргееўна (імёны зменены) пазваніла мне познім вечарам. Яна была ўзрушана да глыбіні душы, слёзы не давалі гаварыць:

— Вельмі прашу, знайдзіце час і прыедзьце да мяне ў любы дзень, бо я заўсёды дома. Хочацца выгаварыцца перад чалавекам, які зразумее, бо вельмі ж цяжка на душы. Але прашу адразу: як будзеце пісаць, не называйце майго сапраўднага імя. Зразумейце, я нікога не баюся. Проста вельмі сорамна...

Я паабяцала і прыехаць, і захаваць яе імя ў тайне, бо, раз чалавек просіць, значыць, на тое ёсць прычыны.

Мы некалі былі добра знаёмы з гэтай слаўнай жанчынай, і калі блізка не сябравалі, то былі ў вельмі прыязных адносінах. Не сустракаліся ўжо даўно, але яна мне іншы раз званіла, каб абмеркаваць публікацыі з нашай любімай "Народнай Волі", якую Аліна Сяргееўна выпісвае вельмі даўно.

...Яна вельмі пастарэла за той час, што мы не бачыліся. І то сказаць: ужо восемдзесят адзін год споўніўся. Больш за сорак з іх аддала школе. Менавіта школа была для яе і домам, і сям'ёй, бо сваёй стварыць не ўдалося. Такі лёс, нічога не зробіш... І таму гарэзлівыя і разважлівыя, хуліганістыя і старанныя ў вучобе Пеці, Вані, Сашы, Веры былі для яе як родныя. Хто быў з бедных сем'яў, то і абноўкі купляла за свае грошы, магла прынесці ў клас кулёк пернікаў ці цукерак, каб пачаставаць усіх дзяцей на перапынку. Яна была настаўніцай малодшых класаў. Як умела выкладаць прадметы! Ні адна праверка ніколі не зрабіла ёй заўвагі, бо не было за што, каб нават і хацелі.

...Яе старое жыллё было чыстым, наколькі дазвалялі сілы, падтрымлівала парадак. Але... Печка даўно не белена, ходнічкі на падлозе працёртыя ледзь не да дзірак, толькі здагадацца можна, што ў іх некалі быў зялёны колер.

Перахапіўшы мой погляд, Аліна Сяргееўна горка ўсміхнулася:

— Багата жыву, праўда? Не зважайце. Я так лічу: абы чыста. Што сама зраблю, а што сацыяльны работнік Люда Вярбіцкая дапаможа. Старанная яна, клапатлівая. Кажа, ходнічкі вам трэба было б новыя прыдбаць. А я ёй: "Людачка, тут абы на ежу ды на лекі пенсіі хапіла б, а яшчэ дроў купіць, за газ і святло заплаціць. Не да ходнічкаў...

Яна некалькі хвілін сядзела задумаўшыся, потым дастала з шафы цяплейшую хустку і завязала на галаву, прыкрыўшы густыя сівыя валасы, накінула на плечы безрукаўку, бо ў хаце было даволі прахладна, відаць, гаспадыня эканоміла паліва. Потым, гледзячы ў акно, у заснежаную даль, ціха загаварыла:

— Я вас вось для чаго паклікала... Не так даўно ва ўсіх школах праходзілі вечары сустрэч з выпускнікамі. Дзяўчаткі з малодшых класаў, я нават і не ведаю, як іх называюць, прынеслі і мне запрашэнне з нашай пасялковай школы. Заўважце, не па пошце прыслалі, а самі прынеслі. І гэта мяне расчуліла да слёз. У дзень урачыстасці на двары было слізка, ногі мае старэчыя ўжо слаба рухаюцца, але вырашыла схадзіць, бо даўно там не была: усё ж хварэю — то ў бальніцы ляжу, то дома.

Узяла я свой кіёк і неяк памаленьку дасунулася да школьнага двара. А там у адным месцы дзеці раскоўзалі сцяжынку, мой кіёк паслізнуўся на лёдзе, і я ўпала. Але, дзякуй Богу, удачна, нічога не паламала і нават моцна не пабілася. Але ўстаць не магу: сіл не хапае. Раптам бачу, мяне падымае на рукі нейкі малады дужы чалавек і няе да школьнага парога. Толькі ў калідоры апусціў ён мяне на падлогу, падаў у рукі кіёк.

— Аліна Сяргееўна?! — усклікнуў са здзіўленнем. — Як я рад вас бачыць!

— А хто ж ты сам будзеш, такі прыгожы, элегантна апрануты, дужы? Бачыш, мяне старую, як пушынку, падняў і ў школу прынёс...

— А я Стась Жалудзевіч. Вы ж некалі мяне вучылі. Ды многіх вучылі, ці ўсіх можна ўспомніць. Ну, вы яшчэ мяне называлі Рыжыкам і гультаём за тое, што не хацеў вучыцца... Маму часта ў школу выклікалі, а яна казала:

"От, такой бяды!.. Не хоча вучыцца, то будзе ў калгасе кароў пасвіць!" — А вы потым заступаліся: "Як вырасце, то, можа, паразумнее. Ён здольны, толькі гультай".

— Памятаю, Стасічак! — абрадавалася я. — Мяркуючы па ўсім, кароў ты не пасвіш.

— Не, Аліна Сяргееўна, я жыву ў Расіі, маю ўласнае прадпрыемства па вытворчасці мэблі. І маму да сябе забраў. Праўда, не ажаніўся яшчэ. Няма часу, — гарэзліва ўсміхнуўся ён сваёй чароўнай усмешкай. — А як вы?

Ён павёў мяне да крэсла ў калідоры і мы, седзячы, паразмаўлялі.

— Жыву, як усе пенсіянеры! — ледзь стрымліваючы слёзы, коратка адказала. Не буду ж на самай справе апавядаць пра тое, што, аддаўшы больш за сорак гадоў працы ў школе, цяпер ледзь зводжу канцы з канцамі, што эканомню кожны рубель, бо трэба ж і на пахаванне нешта адкласці, як горка жартуе мая суседка, на "выпускны баль".

Разумны і добры Стасік зразумеў усё і без майго аповеда, гледзячы на старое паліто з аблезлым каўняром (некалі была норка), на боты, на якіх нават скрозь вялікі слой крэму праглядалі драпіны.

— Так... — задумліва прамовіў ён. — Вы ўсё там жа жывяце, дзе і раней?

— У той жа хаце, мой ты сынку. Старая яна, халодная, вецер свішча праз вокны і ніякія заклейкі ды затычкі не дапамагаюць, — нечакана для сябе пачала я скардзіцца і тут жа спахапілася: — Нічога, неяк дажыву. Ужо няшмат засталося...

Потым мы пайшлі ў залу. Было шмат сустрэч і з іншымі маімі вучнямі, дарагімі хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якія цяпер ужо самі маюць унукаў. Мне падарылі шмат кветак, а мае дзяўчынкі пакінулі на шчоках столькі памады ад пацалункаў, што яны былі чырвоныя, не раўнуючы, як у Дзеда Мароза.

Дадому мяне прывёз Стасік на сваёй шыкоўнай машыне. Я пасаромелася запрасіць яго ў хату, і мы развіталіся ля ганка.

Назаўтра апоўдні, калі я палівала кветкі, што стаялі на падаконніку, насупраць маёй хаты спынілася аўтамашына. Не Стасева, бо я тую добра запомніла, але таксама вельмі прыгожая. З яе выйшаў малады чалавек і накіраваўся да брамкі. Неўзабаве ў дзверы пастукалі. Адчыніла і запрасіла госця зайсці.

— Я на хвілінку, бо вельмі спяшаюся. Вы ж Аліна Сяргееўна Каралькевіч, праўда?

— Так, — пацвердзіла.

— Тады вось гэта вам. — Ён дастаў з кішэні белы пухлы канверт.

— Што гэта, пісьмо? — не зразумела я.

— І пісьмо таксама. Даруйце, я пайду, бо вельмі спяшаюся.

Ён развітаўся і выйшаў на вуліцу.

Дрыготкімі рукамі я дастала з канверта невялікі лісток паперы і стос купюр. Знайшоўшы акуляры, скрозь слёзы прачытала:

"Дарагая, любая мая Аліна Сяргееўна! Калі ўспамінаю нашу сустрэчу, спазмы сціскаюць горла. Вы за сваю шматгадовую працу і талент павінны хадзіць у футры, а не ў аблезлым паліто, і жыць не ў дзіравай хацінцы. Праз свайго сябра і кампаньёна пасылаю Вам крыху грошай. Праз пару месяцаў перадам зноў. Ведайце, я Вас не пакіну. Нізка кланяюся. Ваш Рыжык".

Потым я палічыла грошы. У канверце было два мільёны рублёў. Амаль чатыры мае пенсіі... Цяпер ужо абавязкова куплю новыя ходнічкі. І лекі, і боты, і куртку... Было радасна. І горка, і балюча да слёз...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—28 САКАВІКА 2011 г.

ЧТО ТАМ, В ЛИВИИ?

Где прячется Каддафи?

Силы международной коалиции продолжают наносить удары по военным объектам Ливии и позициям войск, верных Муаммару Каддафи.

Государственное телевидение и другие СМИ, подконтрольные правящему режиму, говорят о многочисленных жертвах и пострадавших среди мирного населения. Представители коалиционных войск утверждают, что удары наносятся лишь по системам ПВО и военным базам. За 4 дня уничтожены десятки единиц бронетехники. По данным оппозиции, контролирующей Мисурату, снайперы-каддафисты, засевшие на крышах зданий, сеют террор среди населения города. Повстанцы утверждают, что снайперы расстреляли по меньшей мере 16 человек.

Поступают сообщения о продолжающихся ожесточенных действиях войск Каддафи против мирных граждан, несмотря на проводимую западной коалицией операцию по их защите.

Тысячи жителей фактической столицы ливийской оппозиции Бенгази вышли в среду на улицы города в знак поддержки действий сил международной коалиции против режима Муаммара Каддафи. Они размахивали красно-черно-зелеными флагами монархического периода, благодарили страны коалиции за создание бесполетной зоны, выражали солидарность с жителями города Мисураты.

Несмотря на поддержку международной коалиции, ливийские повстанцы не добились значительных успехов в последние дни.

Ливийский лидер Муаммар Каддафи и его окружение должны прекратить огонь, вывести свои войска из городов и приготовиться к смене власти. Об этом, как передает ИТАР-ТАСС, заявила вчера журналистам госсекретарь США Хиллари Клинтон. *"Каддафи и его окружение должны сами решить, какими будут их следующие шаги,* — сказала глава американской дипломатии. — *Но мы, несомненно, рекомендовали бы им принять правильное решение, которое бы предусматривало не только реальное полномасштабное прекращение огня, но также вывод войск из городов и подготовку к передаче власти, но без полковника Каддафи".*

Как считают в США, судьба Муаммара Каддафи предрешена, и его уход с поста лидера Ливии неизбежен. Как ранее заявила госсекретарь США Хиллари Клинтон в интервью телекомпании ABC, Каддафи в настоящее время ищет пути бегства из страны. По словам Клинтон, США стало известно, что приближенные Каддафи по его поручению изучают возможности для ухода ливийского лидера с поста и, возможно, выезда из страны, передает РИА "Новости".

"Отчасти это — игра и театр, попытка послать ложный сигнал. Вы помните, как после резолюции СБ ООН Каддафи объявил о перемирии, а затем его силы еще быстрее пошли на Бенгази? Многие из заявлений — именно манера себя вести непредсказуемо. Но отчасти, мы думаем, это делается. И мы бы это приветствовали", — сказала Клинтон, напомнив, что США после начала столкновений в Ливии настаивали на прекращении насилия и уходе Каддафи в отставку.

Где сейчас находится ливийский лидер Муаммар Каддафи, не известно. Он периодически засвечивается в Триполи и делает заявления.

Сергей ИВАНОВ.

В Китае заговорили о политических реформах

Китайский премьер Вэнь Цзябао заявил, что КНР нуждается в политических реформах. По его словам, это единственный способ закрепить те экономические достижения, которые были достигнуты за последние 30 лет.

Вэнь Цзябао не уточнил, какие именно реформы он имеет в виду, однако сказал, что их следует осуществлять постепенно. По его словам, народ должен иметь средство контроля в отношении властей. Одновременно премьер признал, что проведение политических реформ будет нелегким делом в стране такого размера, как Китай. Однако реформы необходимы, заявил премьер.

Москва лишь 68-я

Лондон, Нью-Йорк и Гонконг прочно удерживают звание ведущих мировых финансовых центров. Об этом свидетельствует рейтинг, опубликованный британской аналитической компанией ZYen Group.

Авторы исследования подчеркивают, что между тремя городами-лидерами сохраняется совсем незначительный разрыв. Первые два мегаполиса получили 775 и 769 баллов из тысячи, Гонконг — 759. Следом за ними идет Сингапур с показателем 722, а пятое место разделили Шанхай и Токио — по 694 балла. В десятку лидеров также вошли Чикаго, Цюрих, Женева и Сидней. В докладе отмечается, что самый заметный скачок совершил Сеул: он набрал 25 баллов и переместился на 16-е место, опередив Пекин. Москва и Санкт-Петербург идут рядом на 68-й и 69-й позициях (соответственно 506 и 504 балла).

Афрыканскі востраў стане Еўропай

31 сакавіка востраў Маёта, які знаходзіцца ў Індыйскім акіяне паміж Мазамбікам і Мадагаскарам, стане 101-м дэпартаментам Францыі. У выніку востраў плошчай 374 квадратныя кіламетры стане самай аддаленай ускраінай Еўрасаюза. У ходзе рэферэндуму, які адбыўся 29 сакавіка 2009 года, 95,2 працэнта жыхароў Маёты прагаласавалі за поўную інтэграцыю ў склад Францыі. Такім чынам яны спадзяюцца пакончыць з беднасцю.

У СОСЕДЕЙ

Почему завели уголовное дело против Кучмы?

Генеральная прокуратура Украины объявила о возбуждении уголовного дела в отношении экс-президента Украины Леонида Кучмы, подозреваемого в причастности к убийству журналиста Георгия Гонгадзе.

О том, что второй президент Украины Леонид Кучма, правивший страной с 1994-го по 2004 год, подозревается в причастности к убийству Георгия Гонгадзе, сообщил первый заместитель генпрокурора Ренат Кузьмин, сообщает "КоммерсантЪ". *"Действительно, в отношении Леонида Даниловича Кучмы возбуждено уголовное дело. Он подозревается в причастности к убийству журналиста Гонгадзе"*, — заявил Кузьмин, курирующий главное управление по расследованию особо важных дел.

По словам Кузьмина, знаменитые "пленки майора Мельниченко", которые якобы доказывают причастность Кучмы к убийству, *"все же признаны доказательством по делу, хотя ранее их аутентичность ставилась экспертами под сомнение"*, пишет "Российская газета". Прозвучал вопрос и о причастности к "делу Гонгадзе" нынешнего спикера парламента Владимира Литвина, который в то время возглавлял президентскую администрацию. *"Что касается Литвина, то в рамках уголовного дела будут проверены все версии. Повторяю — все"*, — заявил Кузьмин.

Позже экс-главу Украины три часа допрашивали в Генпрокуратуре, взяли подписку о невыезде,

Бывший премьер Украины Юлия Тимошенко, находящаяся под следствием по делу о бюджетных растратах, возбуждение уголовного дела против Кучмы назвала пиаром Януковича. *"Это такая народная игра в "справедливого" Януковича, которая никогда ничем не закончится. Блеф и показуха",* — написала Тимошенко в своей странице на Twitter.

Руководитель Центра политических и социальных исследований Сергей Таран обратил внимание на тот факт, что экспрезидента не тронула даже "оранжевая команда" власти. Он пояснил, что почти все украинские политики и государственные деятели — представители власти и оппозиции — являются выходцами из гнезда Кучмы. Именно в период его работы на посту президента с 1994-го до 2004 года происходило становление независимой Украины и одновременно — формирование политических сил, кристаллизация лидеров. Несмотря на карьерные и политические зигзаги, украинские деятели сохраняли между собой связи, появившиеся при Кучме.

"В этом контексте уголовное дело против Кучмы может стать сигналом начала очень серьезных перемен в украинской политической системе, рокировок властной элиты", — сказал Таран. Руководитель исследовательского центра "Пента" Владимир Фесенко допускает, что ситуация может свидетельствовать о накале борьбы в окружении Януковича. Возможно, это попытка атаки донецкой части команды действующего президента, которая при Кучме не имела доступа в высшие эшелоны власти, против "недонецкой" части окружения Януковича, тех самых "птенцов гнезда Кучмы".

Эксперты допускают, что уголовное дело против экс-президента вызвано раздражением нынешнего главы государства заявлениями Кучмы и действиями Литвина. Оба политика в последнее время очень резко критиковали власть — и реформы внутри Украины, и внешнеполитические шаги, в том числе связанные с украинско-российскими отношениями. Политолог Таран допускает, что, создав угрозу Кучме, Янукович таким образом послал сигнал о необходимости быть лояльным, покорным и послушным руководителю Верховной Рады, который теоретически может оказаться в списке обвиняемых по тем же делам.

Андрей ПЕТРОВ.

КОРОТКО

Масштаб заражения

В Японии, по официальным данным на вчерашний день, 9700 человек погибли в результате землетрясения и цунами. 16.500 человек числятся пропавшими без вести.

Специалисты министерства науки Японии отслеживают уровень радиоактивных йода и цезия в почве, воде и воздухе вокруг атомной станции "Фукусима Дайити", надеясь оценить масштаб заражения и понять, в какой степени оно скажется на сельском хозяйстве и рыболовстве. В Международном агентстве ООН по атомной энергии (МАГАТЭ) говорят, что ситуация по-прежнему вызывает "серьезную обеспокоенность", хотя и подчеркивают наличие "определенного позитивного развития".

Жителей префектуры Фукусима предупредили об опасности потребления 11 видов зеленых овощей, выращиваемых здесь, а фермерам запретили их продавать. В целом затраты на восстановление пострадавших от землетрясения, цунами и аварии на АЭС районов японское правительство оценивает в 25 трлн иен (более 300 млрд долларов).

В Брюсселе проходит саммит ЕС

Главная тема — обсуждение мер по укреплению стабильности евро. Лидеры ЕС обсуждают также ситуацию в Ливии и других странах Северной Африки и меры по оказанию помощи Японии, пострадавшей от стихийного бедствия.

Спецдокладчик ООН по Ирану

Вчера Совет по правам человека ООН принял решение ввести должность спецдокладчика по ситуации с правами человека в Иране. Члены совета приняли резолюцию, в которой выразили озабоченность усилением репрессий в Иране.

ВВС Израиля нанесли удар по инфраструктуре ХАМАС

Израильская авиация нанесла удары по тренировочным центрам и туннелям для доставки контрабанды в секторе Газа, сообщает агентство "Ассошиэйтед Пресс". За несколько часов до авианалета в центре Иерусалима сработало взрывное устройство, убившее пожилую женщину и ранившее еще почти 40 человек. Это стало первым крупным терактом в городе за последние годы.

Под лозунгом свержения президента Асада

15 человек, в том числе 11-летняя девочка, убиты в сирийском городе Дераа, сообщают местные правозащитники. Они участвовали в похоронах двух из пяти манифестантов, застреленных полицией.

За последнюю неделю Дераа — город на юге Сирии — превратился в арену ожесточенных столкновений сил правопорядка с участниками антиправительственных выступлений. С 15 марта десятки человек выходят на улицы Дамаска и других сирийских городов под лозунгом свержения президента Асада.

Поезд столкнулся с автобусом

10 человек погибло, более 50 получили ранения в результате столкновения поезда со школьным автобусом в китайском городе Урумчи. Потерявший управление автобус перевернулся на железнодорожных путях, после чего в него врезался поезд.

Согласно данным правоохранительных органов, только за минувший год на дорогах Китая погибли около 70 тыс. человек.

Премьер-министр Португалии уходит в отставку

Заявление последовало за провалом в парламенте правительственной программы жесткой экономии, передает ИТАР-ТАСС. Против "Программы стабилизации и роста", вводящей дополнительные меры по сокращению расходов и повышению налогов, выступили все оппозиционные партии. Лидер Соцпартии, премьер-министр Жозе Сократеш посетил начало парламентских дебатов, прослушал речь министра финансов, представлявшего позицию правительства, а затем вышел из зала заседаний под негодующие возгласы депутатов от оппозиции.

В случае невозможности сформировать новое правительство в результате консультаций в Португалии пройдут досрочные выборы. Они могут состояться не раньше конца мая.

З ПІСЬМЕННІЦКАГА ДЗЁННІКА

Леанід ЛЕВАНОВІЧ

Дух Амерыкі

(Пачатак у №№37—42.)

Учора чытаў "Полымя" №10 — артыкул пра Л.Дранько-Майсюка, які напісаў Алесь Бадак. Было прыемна чытаць разумнае, добразычлівае сяброўскае слова. Гэта вельмі добра, калі адзін таленавіты паэт, паэт-песеннік, паэт-інтэлектуал хваліць другога такога ж творцу: паэта-песенніка, песняра хараства і прыгажосці. Добры прыклад падалі на зары XX стагоддзя Купала і Колас, калі сустрэліся ў Смольні ды пасябравалі на ўсё жыццё.

Ёсць у часопісе грунтоўны артыкул Серафіма Андраюка пра творчасць Івана Пташнікава. І.П. — вялікі талент. А хто яго чытае? Памятаю ў бібліятэцы санаторыя "Сасновы Бор" шмат гадоў стаяў ягоны двухтомнік з чыстым фармулярам — карткай кнігавыдач. Я быў першым чытачом.

Днямі Андрэй прынёс часопіс "Кругозор", які выходзіць у ЗША. Ёсць у ім старонкі на ўкраінскай мове. Там прыпіска: спонсар публікацыі — украінская дыяспара. Можа, паслаць ім "Усмешлівую Амерыку"? Прапанаваць, каб надрукавалі "Ліст да Якуба Коласа". А мо іх зацікавіў бы "Бостанскі дзённік"? Але ж дзе спонсары? Бедныя мы, беларусы, былі і ёсць.

Сёння паедзем у штат Мэн. А пакуль што засеў за англійскую мову. Выпісваю афарызмы. Вось гэты мне вельмі падабаецца. Сказана коратка і вузлавата: Time and tide wait for no man — Час і прыліў нікога не чакаюць. Мудра! Па-англійску сем кароткіх слоў. Па-беларуску яшчэ карацей. Трэба запомніць. Усё, што звязана з Часам, мяне вельмі цікавіць. Раман "Бесядзь цячэ ў акіян" я скончыў Гімнам Часу. Гэта лагічна: плынь ракі Бесядзь і Ракі Часу...

13 лістапада.

Усю ноч ішоў дождж. Ды моцны! Ён і зараз лье. Але ўжо слабей. Сёння на гару Маунт Адаменцікус мы б не падняліся. Гэтая гара знаходзіцца ў штаце Мэн кіламетраў за 90 ад Бостана на поўнач. З вяршыні гары адкрываецца надзвычай прыгожы краявід: ланцуг зялёна-бурых гор. Іхні ланцуг рэзка абрываецца: нібы нырае пад ваду. Далей адкрываецца велічная панарама акіяна. Злева бялеўся маяк, міргаў ягоны агеньчык.

На вяршыню гары можна даехаць на машыне, што мы і зрабілі. А назад спускаліся па маршрутнай сцежцы. На вяршыні гары чыстыя акуратныя туалеты, карты маршрутаў. Іх апісанне: уніз — па жоўтай лініі, потым па белай. Тут жа скрынка пад шклом і просьба плаціць ахвяраванні (данэйшэн). Я пажартаваў: хто дае — данэйшэн, хто бярэ — бярэйшэн.

Сцежка шырокая, камяністая. Сям-там камяні ўкладзены папярок, каб вада не размывала сцежку. Андрэй спусціўся на машыне, потым ішоў насустрач нам. Сустрэча адбылася. Мы не заблукалі, неўзабаве апынуліся ў невялікім гарадку Ёрк. Тут і адбылося доўгачаканае спатканне з акіянам.

Нешырокая, мо паўвярсты, затока, скалістыя берагі, на іх прыгожыя белыя домікі, шыкоўныя гатэлі, вузкая стужка пляжа. Прыбой вылізаў пясчаны бераг. Я прайшоў метраў трыста. Слухаў шум прыбою. Вакол не было ні душы. Адно чайкі, белашэрыя, укормленыя, гучна крычалі. Дыхалася лёгка. Вада чыстая, малахітава-зялёная. Як хацелася акунуцца ў воды Атлантыкі! На жаль, ні тады, сем гадоў таму, ні зараз паплаваць у акіяне былому мараку не ўдалося.

Учора Амерыка святкавала Дзень ветэрана. З нагоды нацыянальнага свята Вольчын банк не працаваў. Мы выязджалі а палове 11-й, некаторыя вуліцы былі перакрытыя паліцыяй — рыхтавалася шэсце ветэранаў. А гэта былыя вайскоўцы. Удзельнікі розных ваенных канфліктаў, у якія Штаты ўлазяць штогод. Назіраць за іхнім шэсцем жадання не было.

На многіх дамах вісяць амерыканскія сцягі. На адным было ажно тры: дах над ганкам быў нібы накрыты вялікаю паласатаю прасцінай, два сцягі трапяталіся па баках ганка. Во патрыёт!

У нядзелю гасцявалі у Мішы і Наташы, якія жывуць у Ньютане, такім жа гарадку, як і Вінчэсцер. Старэйшы іхні сын Антон ужо вучыцца ў Чыкага ў платным каледжы. А малодшаму ўсяго два гады і два месяцы. Пятрусь вельмі самастойны, бацька зрабіў яму маленькі турнічок, малы падцягваецца ўжо, набірае моцы, каб яго не зацерлі ў жыццёвым віры.

І ў гэтым застоллі я спытаўся пра дух Амерыкі. А перад гэтым Тацяна, Алегава жонка, у якіх мы гасцявалі раней, спыталася ў мяне: "Як вам спадабаўся рассаднік капіталізму — казіно?"

Я сказаў, што там было цікава, што выйграў сорак цэнтаў. Тацяна ж першай і адказала на маё пытанне:

— У нашым штаце Масачусетс быў цэнтр вызваленчай вайны супраць Брытаніі. Адсюль пайшло змаганне за свабоду. Жыхары штата гэтым вельмі ганарацца. Таму на аўтамабільных нумарах ва ўсіх напісана: "Спірыт оф Амерыка" — "Дух Амерыкі".

— Кожны штат мае свой слоган, — уступіў у гаворку Андрэй. — У штаце Мэн, дзе мы ўчора былі, на нумарах машын пішуць: "Вакаціінланд" — "Зямля вакацый, адпачынку".

— Тут слоган лагодны, — усміхнуўся Міхаіл, гаспадар дома. — У штаце Нью-Хэмпшыр дужа суровы: "Лайф фры ор діе" — "Жыві свабодна або памры!" У інтэрнэце ёсць слоганы ўсіх штатаў.

— Я зраблю раздрукоўку, — паабяцаў Андрэй.

Светлым нядзельным днём гулялі па Бостане. Ноччу быў марозік, з раніцы дзьмуў халодны свяжак, хоць сонца свяціла надта зырка. Праходзілі міма высознага храма. Дзверы яго былі адчынены. Афіша паведамляла, што сёння іграюць Баха. Вецер падганяў у спіну.

— О, Бах — гэта здорава! — ускліknула Вольга, колішняя выкладчыца спеваў у мінскай школе. — Давайце зойдзем.

У вялікай цемнаватай зале гучала ўрачыстая музыка, дружна, зладжана спяваў хор. Пры ўваходзе ўсім давалі праграмкі. Часам хор перапыняў спевы, выходзіў святар, заклікаў усіх памаліцца разам, усе ўставалі, маліліся, потым зноў музыка, велічна гучаў арган, спяваў хор, многія ў зале падпявалі.

Вернікі сядзелі на прыгожых мяккіх лавах. Справа на лаве было голае месца, каб паставіць сумку ці сакваяж. Усё прадумана. Вольга патлумачыла: хор самадзейны, музыкі — таксама аматары. Ніхто з іх грошы не атрымлівае. Храму ахвяруюць сродкі багатыя людзі. Вось ён, дух Амерыкі!

Потым мы доўга хадзілі па горадзе. Людзей на вуліцах шмат. І ўсе вельмі розныя, найбольш маладых кітайцаў, а таксама неграў, мулатаў. І ўсе некуды спяшаюцца. Амаль усе з мабільнікамі. Ну, гэтага дабра цяпер хапае і ў Мінску. Не тое што сем гадоў таму, калі я пісаў Оду сотаваму тэлефону. Па мабільніках мы ад Амерыкі мала адстаем, а мо ўжо і дагналі.

Падняліся на 39-ы паверх хмарачоса Прудэншаў — усяго 52 паверхі. Пры ўваходзе дзяжураць два негрытосы, здаравенныя, пры гальштуках, з пісталетамі, гумовымі палкамі. Высокі негр, плячысты, губасты, затрымаў нас. Запатрабаваў пашпарты. Андрэй паказаў дакумент: працуе на 39-м паверсе. Другі негр сеў за камп'ютар, выпісаў пропускі.

— Строгая ахова з'явілася пасля 11 верасня 2001 года. Раней было прасцей, — прыгадаў Андрэй. — Паказаў пашпарт — і пайшоў.

Некалі ў нас было так у ЦК партыі: паказаў партбілет — і пайшоў куды хочаш.

Вось і 39-ы паверх. Супрацоўнікі фірмы сядзяць за сталамі, сценкі трохі вышэй галавы, кабінетаў з дзвярыма, як у нашых офісах, няма. Дакладней, кабінеты толькі ў начальства. Прэзідэнт кампаніі Марк Аткінс сядзіць у шкляным кабінеце і ўсё трымае пад кантролем. Кабінет віцэ-прэзідэнта на супрацьлеглай палове — ён усё кантралюе там.

Глядзелі з вышыні на Бостан. Вялікі горад. Унізе па вуліцах снуюць людзі, зусім маленькія, як мурашы, рознакаляровыя аўто здаюцца цацкамі. Аэрапорт, здавалася, прытуліўся на самым беразе акіяна, белыя самалёты, нібы зробленыя з паперы, падзьме з акіяна вецер і змяце іх. А калі б на самы верх падняцца? Пэўна, уражанне было б яшчэ мацней.

А цяпер — пра сваё, роднае. Учора ўвечары чытаў сачыненне пяцікласніка Алёшы з Іллянскай школы — яго надрукавала Вілейская раёнка. Гэты нумар я ўзяў свядома, каб прачытаць сваім, асабліва Міколку. Гэтае эсэ заняло першае месца ў Беларусі. Яго пераклалі на англійскую мову і адаслалі ў Швейцарыю на Міжнародны конкурс дзіцячых твораў на тэму аховы прыроды. Алёша напісаў "Ліст чалавецтву" ад імя малога бабраняці. І заняў на Міжнародным конкурсе трэцяе месца. Ведай нашых!

Усе мае, нават Міколка — яму цяжкавата ўспрымаць беларускае, — слухалі ўважліва. Алёшава сачыненне спадабалася. Доўга потым гаварылі пра экалогію, ахову прыроды. Я расказаў пра Іллянскую школу, бо часта бываю там. Летась падарыў школе сто кніг з маёй бібліятэкі. Настаўніца Роза Канстанцінаўна Шэрая стварыла музей "Вілейшчына літаратурная". Ёсць там стэнд, прысвечаны мне, бо я лёсам паяднаны з Вілейшчынай.

A cood becining is half the battle — рус. пераклад: "Хорошее начало — полдела откачало", беларускі варыянт: "Добры пачатак — палова справы". Будзем лічыць, што мой пачатак вывучэння англійскай мовы — удалы. Вучыцца ніколі не позна.

14 лістапада.

Вольга паехала ўжо на працу, а сёмай трэба пабудзіць Міколку. Устае ён цяжка, бо кладзецца позна: то чытае, то сядзіць у камп'ютары. Вучу прачынацца, рабіць масаж вушэй, рук, ног, каб неяк раскатурхацца.

Увечары Андрэй апавядаў, як набывалі дом, афармлялі крэдыт. Часта ён узгадваў 11 верасня — дзень тэракта, якія змяніў жыццё амерыканцаў. Каб не з'язджалі дамоў кваліфікаваныя спяцы-эмігранты, улады загадалі банкам максімальна знізіць працэнт на крэдыты. Таму і нашы змаглі набыць сабе жытло. Любая падзея мае плюсы і мінусы. Дыялектыка.

Дарэчы, служба выратавання — 9—11. Па рэлігійным календары 11.9 — Дзень усекнавення галавы Івана Прадцечы, або Іван-Галавасек. У гэты дзень катэгарычна забаранялася браць у рукі нож.

Усё прадумана. Каварна і жахліва. Але цяпер усё часцей гавораць і пішуць, што тэракт арганізавалі спецслужбы ЗША, каб уварвацца ў Ірак, заволодаць радовішчамі нафты, каб прыціснуць незадаволеных унутры краіны. Рэйтынг Д.Буша тады падскочыў да 80 працэнтаў, але потым рэзка ўпаў.

15 лістапада.

Усё бліжэй дзень ад'езду. Думкі мае ўжо ў Мінску, у Пятрылаве. Як там гаспадарка? Мусіць, заваліла снегам? У Маскве снегу поўна. Можа, яшчэ растане? Рана зіме ўладарыць.

Учора сустрэліся з нашым зяцем Сашам. Жыве ён недалёка, завёз нас з Нетай і Міколку ў кавярню "Сушы". Японская сям'я трымае кавярню. Муж і жонка абслугоўваюць наведвальнікаў. Хударлявы, шчуплаваты, дужа ветлівы японец прынёс чатыры меню — кожнаму па асобніку. Запісаў у нататнік заказ, прынёс чатыры высокія фужэры вады. Затым японка, даволі мажная, шыракатварая, вузкія вочы пад акулярамі, прынесла ў піялах супы. Лыжкі пластмасавыя, але косяць пад фарфор. Пасля супу давялося трохі пачакаць. Міколка сядзеў поплеч з бацькам і ажно свяціўся ад радасці.

Нарэшце японка прынесла велізарную лодку, поўную разнамасных і рознакаляровых кавалачкаў рыбы з рысам. Зялёная гарчыца, руковы корань, падобны на хрэн. Усё было смачна. Неставала марскіх водарасцяў і... сакэ. На сакэ ў гаспадароў кавярні няма ліцэнзіі. Мо і добра. Адбылася цвярозая вячэра, сытная, смачная. Хораша пагаварылі.

Канечне, сушы сем гадоў таму ў рэстаране "Гінза" былі смачнейшыя і сакэ прыемна грэла знутры. Потым з блізкім земляком Валерыем Цурыкавым мы ішлі, абняўшыся, і спявалі "Вы шуміце, шуміце нада мною, бярозы..." Кітайцы — рэстаран месціцца ў кітайскім раёне Бостана — рабілі круглыя вочы і саступалі нам дарогу. Але пра тую сустрэчу я ўжо напісаў.

Саша добра ведае англійскую мову. Гаварылі пра шматзначнасць англійскіх слоў. Асабліва тых, якія абазначаюць часткі цела. Напрыклад, head (hed): галава, пярэдняя частка нечага, нос судна, мыс; вечка, плешка (цвіка); рубрыка, загаловак; напор, ціск слупа вадкасці; верхні брус аконнай або дзвярной каробкі; бабка станка, абух сякеры; баёк молата; качан капусты; кіраўнік. Больш за пятнаццаць значэнняў. Некаторыя тэхнічныя тэрміны апушчаны. Вельмі распаўсюджанае слова: well — добра; be well — быць здаровым; калодзеж, свідравіна. Падобныя прыклады можна доўжыць. Эканомная, універсальная мова. Вось чаму яна пануе ва ўсім свеце.

Сёння даволі моцны вецер. Дом наш — лёгкая будыніна, рыпіць дах, вокны шчыльныя, але здаецца, што яны не вытрымаюць напору вятрыскі. Лёгкія прыгожыя збудаванні ў тутэйшых гарадках. Замест драўляных дошак — усюды сайдынг. Не трэба фарбаваць, не згніе, не палопаецца.

Чытаю кнігу Віктара Кандыбы "Загадки и феномены". Вось цікавая вынятка:

"...должно строго отличать простое сборище людей от сборища лиц, воодушевленных одним и тем же чувством. Такого рода сборища сами собою превращаются в одну огромную личность, чувствующую и действующую как одно целое. Что в этом случае связывает воедино массу лиц, не знакомых друг другу, что заставляет биться их сердца в унисон одно другому, почему они действуют и чувствуют по одному и тому же плану?"

Далей аўтар піша пра псіхічныя хвалі, якія абуджаюць у натоўпе адны і тыя ж пачуцці, падтрымліваюць адзін і той жа настрой, падымаюць актыўнасць, надаюць сілу, імпэт. Асобныя члены, быццам наэлектрызаваныя, імчаць на злом галавы. Аўтар прыводзіць у якасці прыкладу ўзяцце Бастыліі. Чамусьці не згадвае штурм Зімняга палаца, рабаванне маёнткаў.

Некалі пра такое адчуванне ўздыму падчас атакі апавядаў мне Міхась Ласоўскі, былы франтавік, выдатны краязнаўца, бібліятэкар з Хоцімскага раёна Магілёўшчыны.

Прыгадалася, як ён выступаў на партсходзе ў Саюзе пісьменнікаў. Дастаў з кішэні кніжачку маіх нарысаў "Зялёны трохкутнік": "Вось кніжка, якая можа пераважыць цэлы том". Для мяне гэта была прыемная нечаканасць. А Леанід Дайнэка, які сядзеў недалёка, прабасіў: "Цёзка, гэта народ гаворыць. Віншую!" Вось такая згадка на амерыканскай зямлі. Мабыць, таму, што я хачу дамоў.

Таму і афарызм адпаведны: East or West, home is Best — У гасцях добра, а дома лепш.

16 лістапада.

Дождж, вецер. Учора было плюс 55 па Фарэнгейце, сёння ўсяго 35 (плюс 2—3 градусы). Рэзка падае тэмпература і тут. У Беларусі вось-вось зіма. У Сібіры маразы да 50 градусаў. Снег ляжыць і на поўначы Амерыкі. На мондэй (панядзелак) абяцаюць пацяпленне. А чым парадуе Парыж? Там страйк транспартнікаў — бастуюць машыністы-чыгуначнікі. І ў Нямеччыне — тое самае.

У Штатах пакуль ціха. Жратвы хапае, праца ёсць. Хто хоча нешта рабіць, той працу мае. Пакуль бекярд (задні двор) ніхто не чапае, амерыканцы спяць спакойна.

Вольчына каляжанка (тэлеркасірка) бядуе: убачыла на мабільніку свайго бой-фрэнда нумар тэлефона яго менеджара — узнікла рэўнасць. Чаму яна тэлефануе яму ў нерабочы час? Яна не мае права гэта рабіць. Ён можа баяцца яе. Бо яна — начальніца, можа прымусіць да сужыцельства. "Патэлефаную і скажу, каб яна гэтага не рабіла. Магу абвінаваціць у сексуальным дамаганні. Яе могуць зняць з пасады". Во як строга! У Штатах такая строгасць існуе. Калі начальнік некалькі разоў пажадліва паглядзеў на падначаленую жанчыну, выклікаў адну ў кабінет, гаварыў без сведкаў, можна падаваць у суд.

Затое геі маюць права афіцыйна рэгістраваць шлюб. Лесбіянкі жывуць між сабою, педарасты — самі сабою. Свабода! Можа, і ў гэтым дух Амерыкі?

Сёння — другая пятніца. Дзень зарплаты ў амерыканцаў. З 24.00 кампанія, якая займаецца налічэннем грошай, пачынае пералічваць на рахункі (экаунты) грошы, віртуальна. Любы супрацоўнік у пятніцу ўранні можа ўключыць камп'ютар і ўбачыць, колькі яму адваліла фірма, колькі вылічылі таксаў-падаткаў.

Вось што расказаў Андрэй. У аўторак фінансавы менеджар "Інвэйшэн машын" паведамляе кампаніі, якая іх абслугоўвае, колькі ўсяго грошай яна выдзяляе і колькі каму персанальна. Гэтая кампанія вылічвае ўсе таксы-падаткі і пералічвае грошы на рахункі супрацоўнікаў. Рэвізорам лёгка правяраць дзейнасць "Інвэйшэн машын". Яны ў ейным офісе могуць не паказваца гадамі, правяраюць спецыяльную кампанію, якая займаецца разлікамі. Сама можа знаходзіцца ў Бостане, Нью-Ёрку або Вашынгтоне. Вось такі фінансавы досвед.

Андрэй прынёс учора газету "Бостан Глоб". Я пагартаў. Паспрабаваў пачытаць загалоўкі. Зацікавіў допіс пра бібліятэку. Папрасіў Міколку, каб пераклаў. Ён прачытаў некалькі радкоў і кажа: "Дзядуля, мне цяжка. Я не чытаю газет", — і адсунуў "Бостан Глоб". Зноў надзеў навушнікі і пачаў ваяваць з камп'ютарнымі страшыдламі. А я згадаў, як у Магілёўскім культасветвучылішчы цішком здымаў са стэнда ў калідоры газету "Праўда", прагна чытаў яе і вешаў назад. Мне ніхто не раіў гэта рабіць, ніхто не агітаваў. Значыць, прага ведаў жыла ўва мне ўнутры.

Што будзе з Амерыкай, калі такія хлопцы вучацца ў школе? А Міколка далёка не самы горшы вучань. Большасць адзнак у яго выдатныя. Дзіўлюся, што ён вельмі мала чытае. Не цікавяць яго ні англійскія, ні іспанскія, ні рускія кнігі. Зусім не цікавяць газеты. Камп'ютар замяняе ўсё.

На абед Нета зварыла капусту з мясам — з косткай, як у Пятрылаве. Прыехала Волька, прыйшоў са школы Міколка. Паабедалі.

Волька расказала пра "шахцёраў". Менавіта так — шахцёрамі — у Нью-Ёрку расіяне, беларусы, украінцы між сабою называюць неграў. Калі сказаць на вуліцы "негр", або "негрытос", або "чорны" — многія з іх гэтыя словы разумеюць і, калі пачуюць пры сведках, могуць падаць у суд. Дарэчы, у Бостане шмат неграў сярод палісменаў. Здаровыя, плячыстыя, у белых куртках з рознымі прыбамбасамі, з пісталетам, яны выглядаюць імпазантна.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—28 САКАВІКА 2011 г.

Леанід ЛЕВАНОВІЧ

Дух Амерыкі

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

Афарызм не мае дачынення да тэксту. Але нечым ён спадабаўся: All clouds are not rain clouds — Не ўсе аблокі — дажджавыя хмары.

17 лістапада.

Сонечны светлы ранак. Неба чыстае, як шклянка або як ніўны кухаль.

Напісаў ліст галоўнаму рэдактару "Кругозора". Сёння адашлём яму ліст і кнігу. Можа, і зацікавяцца. Ліст давялося пісаць ад рукі, бо ў камп'ютары няма рускага шрыфту. Стараўся пісаць разборліва. У канцы папрасіў прабачэння, што пішу ад рукі і не магу перадаць ліст і кнігу асабіста. Калі часопіс надрукуе "Ліст да Якуба Коласа" на беларускай мове — гэта будзе здорава! Ды без спонсара! Як знак павагі да Беларусі — радзімы Тадэвуша Касцюшкі.

На апошняй старонцы "ЛіМа" артыкул "Мой Віцебск". Яго аўтар — Мікалай Лістапад. У пісьме да галоўнага рэдактара ён называе сябе прыхільнікам беларускай мовы з Масквы, кажа, што паходзіць з данскіх казакоў, па родзе заняткаў — усходазнавец, доктар гістарычных навук. "Цікаўлюся беларускай мовай і наогул Беларуссю. Мову вывучаю самастойна, — піша М.Л. — Яна ў вас прыгожая і мілагучная. Шкада, што не ўсе беларусы размаўляюць па-беларуску. Дасылаю вам нарыс пра Віцебск". І заканчвае артыкул: "Я чытаю газету "ЛіМ" з задавальненнем". Малайчына, усходазнавец, этнічны данскі казак!

Гэты нумар тыднёвіка сапраўды цікавы. Пад артыкулам Лістапада падвярстана нататка ветэрана Вялікай Айчыннай Міхася Тычыны са Слуцка "Ці пачуем мы вясельныя песні?". Вось што ён піша: "Хіба можна ўявіць украінскае вяселле без народных песень, якія гучалі яшчэ ў часы Тараса Шаўчэнкі, Мікалая Гогаля? Горка і балюча ўсведамляць, як занядбалі мы, беларусы, за апошнія дзесяцігоддзі сваю нацыянальную культуру, у тым ліку і вясельныя песні".

Сапраўды, горка і балюча гэта ўсведамляць. Ветэран Міхась Тычына апантана змагаецца за Беларушчыну. Дай Божа яму здароўя! І мне — таксама, бо планаў багата.

А першай гадзіне прыехала пошта. Белы фургончык з чырвонымі і сінімі палосамі, ззаду паблісквае чырвоныя, нібы ружы, габарытныя агеньчыкі. Па борце вялікія сінія літары: "Дзяржаўная паштовая служба". Машына спыняецца ля кожнага дома, вадзіцель не зачыняе дзверку. Каля нас матор заглушыў, усунуў у паштовую скрынку пісьмы, рэкламныя часопісы. Я выйшаў, мужчына азірнуўся, усміхнуўся, кінуў: Хау ду ю ду?" Я адказаў: "Сэнкью!" Таксама ўсміхнуўся, як даўняму сябру. Яшчэ адна з праяў духу Амерыкі — ветлівасць, добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў.

Прачытаў у таўшчэразным часопісе "Караван" артыкул пра П'ера Кюры і Марыю Складоўскую, пра іхняе вялікае каханне, геніяльнае адкрыццё радыю. Марыя Кюры стала і першай ахвярай свайго адкрыцця — яна памерла ў 1934 годзе ад лейкеміі. А перад гэтым яна паспела атрымаць другую Нобелеўскую прэмію. Пасля смерці ўбачыла свет апошняя яе кніга "Радыеактыўнасць".

Во дзе карані чарнобыльскай трагедыі! Бяда, што ўсе вялікія адкрыцці чалавечага розуму часта ідуць на згубу чалавека.

Пабудова 110-павярховых вежаў-блізнятаў на Манхэтэне — найвялікшае дасягненне будаўнікоў. Самалёт "Боінг" — цуд сучаснай авіятэхнікі. Злая рука чалавека-самазабойцы накіравала лайнер з сотнямі нявінных людзей на высозны прыгожы дом, асветлены ранішнім сонцам. У ім таксама былі людзі. Затым другі самалёт уразаецца ў суседні дом. Гэтыя "Боінгі" ўзляцелі ў Бостане. Адсюль у панядзелак 19 лістапада павінен узляцець і наш "Боінг". Дай Божа нам мяккую пасадку ў Парыжы і ў Мінску. Хутчэй бы ў Пятрылава! У свой лес. Там лёгка дыхаецца, хораша думаецца. А думкі часта трывожныя: куды ідзе чалавецтва?

As you make your bed, so you must lie on it — літаральны сэнс: як пасцеліш, так і паспіш. Або: Што пасееш, тое і пажнеш.

19 лістапада.

Яшчэ адзін прыгожы ранак. Не верыцца, што гэты ранак — перадапошні на амерыканскай зямлі. Неба сёння зацягнута хмарамі, але не густымі і не цёмнымі, светла-шэрымі, лёгкімі, быццам капай захутаны нябесны купал. А на ўсходзе святлее, ружавее — мабыць, сонца выб'ецца з-за хмар. Чуваць аддалены гул акіяна. Значыць, вецер не слабы.

Учора ў бібліятэцы разглядалі геаграфічныя атласы. На асобным століку — карты ўсіх мацерыкоў, потым кожны мацярык паасобку, потым фрагменты. Асобныя рэгіёны. Тут ужо маштаб большы. На карце еўрапейскай часткі Расіі знайшоў Магілёў, Крычаў, Касцюковічы, затым адшукаў Вілейку. Адзін райцэнтр дарагі ад нараджэння, другі зрабіўся такім за апошнія 23 гады. На карце Еўропы знайшоў і затоку Брыстоль. Некалі ў Магілёве (да 1917 г.) быў гатэль "Брыстоль". Па тым часе шыкоўны. Затым бальшавікі яго зачынілі, бо не было каму спыняцца ў ягоных нумарах. Надбудавалі трэці паверх і адчынілі ў будынку культасветвучылішча імя Крупскай. У ім я вучыўся. За тры гады вучобы ніхто ніколі не сказаў, што ў будынку, у якім вучымся і жывём на першым і другім паверхах (на трэцім былі аўдыторыі для заняткаў), некалі быў фешэнебельны гатэль, што ў Англіі ёсць порт Брыстоль і аднайменная затока. І каля далёкай Аляскі ёсць таксама затока Брыстоль.

Я дазнаўся пра гэта з кнігі Вячкі Целеша "Гарады Беларусі на старых паштоўках", якую набыў на падарунак сваім амерыканцам. І зрабіў геаграфічна-гістарычнае адкрыццё.

А цяпер зусім пра іншае: вынятка з кнігі Віктара Кандыбы "Загадкі і феномены". Першы ў свеце аўтамабіль сканструяваў і пабудаваў рускі механік Лявонцій Шамурэнкаў у 1752 годзе. Аўтамабіль называўся "Самобеглая коляска". Самы магутны аўтапоезд пабудавалі рускія інжынеры з Масквы і Чалябінска для Цюменскай вобласці. Машына мае 576 колаў і можа везці 1300 тон. Вось гэта махіна! Нават на амерыканскім хайвэі такога не ўбачыш.

А палове дзявятай вецер разагнаў хмары, зноў бязвоблачнае сіняе неба. Як пісала Наталля Арсеннева: "Неба сіняе, сіняе, сіняе, ані межаў у ім, ані дна". Гэта страфа з верша "Красавік", які аўтарка прысвяціла свайму настаўніку Максіму Гарэцкаму. Наталля нарадзілася ў горадзе Баку, паходзіць з дваранскага роду Арсеневых, продкаў Лермантава па матчынай лініі. І вось гэтая рускамоўная дзяўчына закахалася ў беларуса і стала выдатнай беларускай паэткай. Хіба гэта не дзіва! Не толькі Беларусь адпускала сваіх таленавітых сыноў і дачок то ў Расію, то ў Польшчу, а то і ў далёкі свет, як Ігната Дамейку, Мікалая Судзілоўскага і шмат іншых. У дадзеным выпадку Расія падарыла нам сваю таленавітую красуню. Большую частку жыцця Наталля Арсеннева мусіла правесці на амерыканскай зямлі. Тут напоўніцу раскрыўся яе магутны талент.

У мае запісы Наталля Арсеннева ўварвалася нечакана. Калі садзіўся за стол, не думаў, што ўзгадаю пра яе, хоць гэтая згадка цалкам заканамерная: быць у Амерыцы і не згадаць пра вялікую патрыётку Беларусі — недаравальны грэх. Гэты экспромт ратуе мяне ад такой памылкі.

А якое зараз неба над Беларуссю? Мусіць, хмарнае. Можа, ідзе снег, а мо дождж? Тут клімат больш спрыяльны. Бераг акіяна, горы, лясы, але хапае ўрадлівых палеткаў. Каланісты не былі дурнямі, хутка ацанілі новую тэрыторыю. І пачалі актыўна засяляць яе, выцясняючы, а часам знішчаючы, карэнных жыхароў — індзейцаў.

У бібліятэцы мы разглядалі Усходняе ўзбярэжжа Амерыкі, штат Масачусетс, Бостан. Знайшлі Вобурн — суседні з Вінчэсцерам гарадок, дзе працуе Вольга. У штаце Нью-Хэмпшыр адшукалі гару, на вяршыню якой узбіраліся, возера. А ў штаце Мэн — горад Ёрк, дзе адбылася сустрэча з Атлантыкай. На сталах у бібліятэцы здвоеныя настольныя лямпы. Умацаваныя, іх нікуды не пасунеш. У нядзелю бібліятэка нейкі час не працавала — у горада не было сродкаў. Знайшоўся багаты спонсар. Даў грошай, цяпер бібліятэка працуе і ў нядзелю. Яшчэ адзін штрых амерыканскага жыцця.

Учора вельмі ўразіў гаспадарчы магазін шведскай карпарацыі ІКЕА. Велізарная крама, на двух паверхах. На другім — выстава мэблі, электратавары, посуд, усё для дома, для спальні, для кухні. Тут паведнікі бяруць вялізныя жоўта-сінія — пад колер шведскага сцяга, — торбы, вешаюць на плячо і пакуюць усім, што падабаецца. Наколькі дазваляе кашалёк або крэдытная картка. Мэблю атрымаеш на першым паверсе, тут яна складзена, упакавана, месціцца на высозных стэлажах. Мы накуплялі розных рушнічкоў, ходнікаў, набор каструляў, упакаваных у адной, большай, яны падобныя на казахскія піялы. Спадабаліся мне абшытыя матэрыяй падкладкі на сядзенні крэслаў — 1 долар штука. Яны маглі б служыць бакавым уцяпленнем для пчол. Але... дужа далёка везці. Можа, і ў нас нешта падобнае ёсць.

На першым паверсе пад агромністымі каробкамі з кардону ўбачыў нашы вырабы — драўляныя паддоны. Падобныя вырабляюць у лясніцтве ў Радашковічах. За бясцэнак прадаём. А тут прывезлі мэблю з паддонам — гані за яго 18 баксаў. Маеш права яго не браць. Тады баксы вернуць. Дарэчы, на першым паверсе жоўтую торбу трэба памяняць на цялежку, што мы і зрабілі.

Перад выхадам, пасля аплаты за пакупкі, можна паесці. Харчаванне таннае, смачнае марозіва — на тваіх вачах яго робяць. У вафельную формачку яго спіралямі "накручвае" спрытны мулат. Сасіскі, каўбаскі, смачныя булкі. Людзі стомяцца, находзяцца, сядуць на высокія крэслы за драўляныя сталы, са смакам падсілкуюцца. Асабліва тыя, хто шмат чаго набыў.

Пішу і пазіраю на тоўсты маляўнічы каталог фірмы ІКЕА — назва напісана вялікімі сінімі літарамі. Чорныя лічбы — 2008. Яркія паласатыя матрацы, падушкі, на першым плане — белыя стол, за ім блакітныя канапы. Далей чырвоныя кніжныя шафы — іх дзве. Між імі буйныя белыя лічбы — 599. Усё-ткі не 600! Адзін бакс атрымаеш на развод. Хоць тут амаль усе і ўсё набываюць крэдытнымі карткамі. Апісваю каталог, таму што ён сам — твор мастацтва.

Сёння хачу напісаць пра нашага гіда — спадарожнікавую навігацыйную сістэму (GPS). Калі куды ехалі, Андрэй устанаўліваў яе на панэлі, даваў заданне: выбраць аптымальны маршрут, колькі часу спатрэбіцца на дарогу. Невялікая прамавугольная пласцінка-экран свяцілася, быццам падмігвала, на хайвэі тры разы паведамляла, што неўзабаве паварот: спярша за 1 мілю, потым за палову мілі, потым за чвэрць мілі. У горадзе інфармавала за сто метраў. Калі не там павярнуў, то спадарожніца папраўляе. Якая разумніца! Сотавы тэлефон і спадарожнікавая навігацыйная сістэма не могуць не здзіўляць.

Увечары заходзіў на піва Кастусь-алхімік. Родам ён з Піцера, кандыдат хімічных навук. На фірме ягоныя калегі: ірландзец — імігрант у трэцім пакаленні, выхадзец з Венесуэлы, жанчына з Перу, а другая — з Італіі. Усіх яднае англійская мова, супольная праца — жаданне зарабіць на жыццё. Можа, і ў гэтым дух Амерыкі?

Мы пілі светлае піва "Карона", вырабленае ў Мексіцы. А яшчэ Кастусь прынёс тры бляшанкі піва "Гінней", прадукт фірмы Ангейзер Буш. На гэтым бровары мы былі на экскурсіі.

Афарызм такі: The morning sun never last a day — ранішняе сонца поўны дзень свяціць не будзе. Што праўда, то праўда.

20 лістапада.

Вось і надышоў дзень ад'езду. Прамільгнуў час вельмі хутка. Дні, пазначаныя ў календары, час зрываў, як вецер зрывае жоўтае лісце з клёнаў.

Уранні, а сёмай гадзіне, сцішана затрашчаў Міколкаў будзільнік і рэзка сціх: хлопец зацісну яго і павярнуўся на другі бок. Давялося мне будзіць унука. Параіў добра пацягнуцца, пацерці вушы, пальцы рук, паварушыць нагамі. Сяк-так разварушыў.

Мы з Андрэем падвезлі яго да школы. Пасля ўрокаў Міколка пойдзе на працу ў краму. У пятніцу ён працуе з 15 да 21, у суботу — з 12 да 20. Падае тавары, пакуе пакупкі, нешта і сам прадае. Працуюць, як правіла, удвух: ён і старэйшы нехта. Гаспадар крамы — італьянец. У краме працуе ўся яго сям'я. Сямейны бізнес.

Учора Мікола з Андрэем праз інтэрнэт зрабілі пакупкі для ўнукавага камп'ютара на 440 баксаў. За Міколкавы грошы! У яго ёсць свой эканут (рахунак) у банку. Таксама прыкмета амерыканскага жыцця.

На пошту мы прыехалі без 10 восем. Уваходныя дзверы былі адчыненыя, а акенцы закрытыя. На сталах розныя канверты. Выбірай, падпісвай, не стой на вуліцы, як у нас. Ды раней пошта не адчыняецца. А восьмай паднялася шторка-жалюзі. Здаровы, таўсматы мужчына з бародкай павітаўся, запрасіў падыходзіць. Да акна, шырокага, без шкла, вёў зігзагам драўляны турнікет. Да акна падыходзіць адзін чалавек, ніхто яму ў патыліцу не дыхае, як у нас. Мужчына — аператар. Насупраць яго жанчына-памочніца. Андрэй падаў канверт, сказаў, што пасылае бук (кнігу). На кнігі тарыф таннейшы, і ўсё роўна злупіў паштар 3,50 долара. У нас я пасылаю кнігі, канверты таўсцейшыя, больш важкія, але кошт прыкладна 1200 р. — гэта 55—60 цэнтаў. Амерыканская пошта амаль у сем разоў даражэйшая. Аклады вышэй, таму працуюць мужчыны.

Гаварыў учора з Раманам Кардонскім. Дзякаваў за кнігу "Бесядзь цячэ ў акіян". Пачаў чытаць — не адарвацца, а часу няма. Напярэдадні свята Сэнксгівін — чатыры дні вольныя. Тады займецца чытаннем. Праца душыць чалавека на амерыканскай зямлі.

Пішу гэтыя радкі, а па зялёнай траве бэк-ярда скача шэрая вавёрка, разгульвае чародка шызых галубоў. Вавёрка гэткага ж колеру, як і галубы. Птушкі падобныя на нашых. Пастава, хвост, звычкі вавёркі, як у нашай рыжухі, а колер поўсці інакшы.

А цяпер зусім пра іншае. Хачу апісаць Міколкаў пашпарт. Дакумент моцна ўражвае. Партрэты прэзідэнтаў, іхнія выказванні пра дэмакратыю, пра сцяг, герб. Далей малюнкі прыроды. У пашпарце ўся гісторыя, геаграфія, эканоміка. Кінуліся ў вочы словы: Амерыканская дзяржава просіць усіх аказваць падтрымку грамадзянам ЗША. Сцяг бела-чырвоны, сіні, прыняты 14 верасня 1777 года. Спярша было 13 штатаў і 13 зорак на блакітным фоне. Цяпер, пасля 1959 г., 13 палосак і 50 зорак. На 4-й старонцы — арол, каласы, сцяг. Потым сілуэты вялізных кактусаў, далей заснежаныя горы. На гэтым фоне словы Джорджа Вашынгтона. Будынак кангрэса. Вынятка з Дэкларацыі аб Незалежнасці, партрэт і выказванне Аўраама Лінкальна, карабель з белымі ветразямі, над ім ці то чайкі, ці то альбатросы.

Далей выказванне змагара за роўнасць неграў Марціна Лютэра Кінга. Тут жа — арол, горы і бізоны, падобныя на нашых зубраў. На старонках 18—19 — сімвалічныя каласы пшаніцы, араты арэ поле на парцы валоў. Наступныя дзве старонкі — каўбоі на конях гоняць статак кароў. А ўверсе выказванне Ліндана Джонсана. На стар. 22—23 лясістыя горы, бераг акіяна, на пярэднім плане імчыць паравоз, з ягонай трубы вырываецца слуп дыму. Карціна! Адгарнуў наступныя дзве старонкі — зноў горы, імклівая рака, мядзведзь злавіў вялізную рыбіну, справа — сілуэт індзейскага ідала, а зверху словы пра ўдзячнасць індзейцам, якія жылі, жывуць і будуць жыць на гэтай зямлі. Сэнксгівіндэй — Дзень удзячнасці індзейцам, нацыянальнае свята Амерыкі.

А вось і статуя Свабоды. Гэта 28-я старонка. На апошняй, 29-й — трэцяя старонка вокладкі — сілуэт Зямлі, Месяца і касмічны спадарожнік.

Пашпарт ЗША на чатыры старонкі карацейшы за наш, а колькі дае патрэбнай інфармацыі! Яго можна разглядаць, чытаць, вывучаць паўдня. У ім уся гісторыя і геаграфія краіны. Можа, адсюль бярэ пачатак дух Амерыкі?

Дык што ж такое The spirit of Amerika? Прызнаюся шчыра, дакладна і поўна сфармуляваць яго не адважваюся. Але некаторыя рысы амерыканскага менталітэту, асаблівасці жыцця амерыканцаў мне ўдалося падгледзець. Увогуле, калі думаю пра Дух Амерыкі, дык адчуваю сябе як талстоўскі Левін: той углядаецца ў зорнае неба, дзівіцца яго прыгажосці, велічнасці, неабсяжнасці, у галаве б'ецца думка — дзе ж тут Бог? Пэўна, ён ёсць, бо ўсё створана не само сабою. Ёсць і Дух Амерыкі, які яднае шматнацыянальнае рознакаляровае насельніцтва — цяперашніх і даўніх эмігрантаў, выхадцаў з розных краін свету — у адзіны трохсотмільённы народ.

А вось чаму трэба нам вучыцца ў амерыканцаў, магу сфармуляваць больш дакладна, бо і пра гэта я пытаўся ў многіх суразмоўнікаў. Самы змястоўны адказ даў піцерскі вучоны-хімік Кастусь: у амерыканцаў трэба вучыцца адносінам да справы, цвярозасці, дысцыпліне. Кіраўнікі вельмі ветлівыя, уважлівыя. Калі добра працуеш, цябе павысяць, прыбавяць заробак. Тэхніка бяспекі высокая, расійскага авось няма. Усе інструменты высокай якасці. Затое і вырабы выдатныя.

Сёння дзень хмарны. Можна падумаць, што неба зажурылася, таму што мы ад'язджаем. А сіноптыкі абяцалі сонца і плюс 45—50 градусаў па Фарэнгейту. А ёсць усяго 30. Праўда, на Сэнксгівін (22 лістапада) абяцаюць пацяпленне. Даўно збіраўся запісаць, як тут пераводзяць тэмпературу па Фарэнгейту ў градусы па Цэльсію. Дапусцім, па Фарэнгейту плюс 55, адняць ад гэтай лічбы 32, атрымаем 23. Гэтую лічбу дзелім на 9 — вынік 2,5, памножым на 5.

Канчатковы вынік — 12,5 градуса па Цэльсію. Во, якое складанае вылічэнне! А я б зрабіў прасцей: 55 дзяліў на пяць, амаль тое самае.

Што ж, бывай гасцінная зямля Амерыкі. Дзякуй за ўсё. За шчодрае сонца, чыстае неба, свежае паветра, за багатыя крамы, хуткасны хайвэй. За ветлівасць і ўсмешкі тваіх людзей.

Гуд бай, Амерыка! Мажліва, пашанцуе, і яшчэ раз буду на тваіх імклівых дарогах... Мажліва, яшчэ раз убачымся.

***

Просіцца да майго дзённіка кароткі дадатак. Нядаўна прыляцела з Амерыкі радасная вестка: Вольга нарадзіла сына. Я стаў тройчы дзедам. Цяжка паверыць, што на далёкай амерыканскай зямлі з'явіўся на свет хлопчык Максімка. У жылах яго цячэ кроў розных нацыянальнасцяў: бацькі нашага зяця Андрэя нарадзіліся ў малдаўскім горадзе Дубасары. Маюць габрэйскія, малдаўскія, рускія і ўкраінскія карані. Мы з жонкай беларусы. Можа, у наш камп'ютарны век ён стане Максімам-кніжнікам? Будзе пісаць па-англійску і па-беларуску. Наша літаратура мае трох славутых Максімаў: гэта Багдановіч, Гарэцкі, Танк. А можа, Макс Бандарэнка стане Прэзідэнтам ЗША? Мае права. Бо ягоная маці — грамадзянка Амерыкі. Дый прэцэдэнт ёсць: у 1892 годзе магіляўчанін Мікалай Судзілоўскі пераехаў з Сан-Францыска на Гавайскія астравы, дзе яго абралі сенатарам. А праз нейкі час — і прэзідэнтам сената.

Усё для Максімкі яшчэ наперадзе. Але сваім нараджэннем ён перайначыў ужо жыццё не толькі сваіх бацькоў. Бабуля Рагнеда рыхтуецца ехаць за акіян — няньчыць унука. Багатая Амерыка дае на догляд дзіцяці ўсяго тры месяцы. Дзіцячых ясляў і садкоў дзяржаўных няма. А потым, можа, і мне давядзецца ехаць на дапамогу — быць у ролі нянькі. Значыць, новае спатканне з Амерыкай павінна адбыцца.

АФІЦЫЙНА

Праца сантэхніка ў Беларусі каштуе больш, чым урача

Тое, што беларускія медыкі ў адрозненне ад сваіх калег з еўрапейскіх краін зарабляюць капейкі, вядома ўсім. Але, напэўна, мы нават не здагадваемся, як абясцэнена, зганьбавана праца ўрача ў нашай краіне. На выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аховы здароўя Роберт Часнойць агучыў лічбы, ад якіх, безумоўна, разгубіліся нават самі медыкі.

Аказваецца, сёння па ўзроўні аплаты за гадзіну працы медыцынская галіна займае — увага — 11-е месца ў краіне. Калі быць больш дакладнымі, то адна гадзіна працы медыцынскага работніка "каштуе" 5527 беларускіх рублёў. Так у Беларусі не ацэньваецца нават праца сантэхніка. У жыллёва-камунальнай гаспадарцы сярэдні кошт гадзіны працы складае 6853 рублі.

У прамысловасці гэты паказчык дасягае 8864 рублёў, а ў апараце органаў дзяржаўнага кіравання — 9925 рублёў. Лідзіруюць у гэтым спісе будаўнічая галіна — 10.171 рубель за гадзіну працы і банкаўскія арганізацыі, якія гадзіну працы сваіх супрацоўнікаў ацэньваюць у сярэднім у памеры 14.193 рублі.

Менш за работнікаў медыцынскай галіны зарабляюць толькі ў сельскай гаспадарцы, сферы сацыяльнага забеспячэння і культуры, але гэтае адставанне зусім нязначнае.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

СЛЫШАЛИ?

К 9 Мая под Гродно снова появятся партизаны

Правда, лесные братья будут ненастоящими. Их сделают из дерева два местных мастера.

Резчики по дереву **Николай Скляр** и **Валентин Богдевич** специально к 9 Мая создают из дуба четыре фигуры партизан. Увидеть "защитников" можно будет в зоне отдыха "Гарадзенскі маёнтак "Каробчыцы" в Гродненском районе. Мастеров на работу вдохновило не только славное историческое прошлое родины, но и банальная выгода. Комплекс "Гродненская крепость. Партизанский лагерь" станет еще одной достопримечательностью зоны отдыха. Посетители смогут не только отдохнуть, но и полюбоваться на землянки и деревянных партизан. К слову, за идею создания стилизованного партизанского лагеря владельцы зоны отдыха взялись серьезно. Они сумели отыскать консультантов — участников Великой Отечественной, которые помогут им воссоздать лесной лагерь максимально правдоподобно.

Мария МАЛЕВИЧ.
Фото: *vgr.by*

ПРЕМЬЕРА

Фильм-сенсация от «Беларусьфильма»

Режиссеры сравнивают работу на Национальной киностудии с постоянной борьбой. Но трудности не помешали режиссеру Елене Туровой выпустить новый детский фильм "Рыжик в Зазеркалье", за премьерой которого наблюдала "Народная Воля".

Во время прошлого кинофестиваля "Лістапад" режиссер **Андрей Кудиненко** сказал, что производство кино на "Беларусьфильме" сродни подвигу. На днях **Елена Турова** почти повторила слова коллеги. Говоря о своем новом фильме-сказке "Рыжик в Зазеркалье", режиссер заявила, что во время съемок вся группа буквально *"бросилась на баррикады"*, а множество новых ходов *"держались только на фантазии"*. Между тем новый детский фильм Туровой на киностудии "Беларусьфильм" называют не иначе, как сенсацией.

Безусловно, новая картина имеет серьезную заявку на победу: качественных и действительно детских сказок в стране, да и в ближайшем зарубежье, не снимали уже очень давно. Кроме того, визуальные эффекты в "Рыжике" просто новаторские для белорусского кино. В фильме есть и анимированные персонажи, и модная нынче 3D-графика. При более чем скромном бюджете в 1 миллион долларов съемочная группа сделала все возможное для того, чтобы картина не выглядела пародией на кассовые голливудские истории.

По иронии судьбы те эффекты, благодаря которым фильму предрекают успех, едва не стали могильным камнем для истории веселой девочки с рыжими волосами...

Недетская история

Ситуация с картиной "Рыжик в Зазеркалье" напомнила старый анекдот, в котором Колобок, дожевывая остатки лисицы, подумал, что у него вышла совсем не детская сказка. Талантливый сценарий автора картины Елены Туровой смог заиграть в полную силу только благодаря визуальным эффектам. Проблема была в том, что специалистов, способных осуществить все задумки режиссера, в стране совсем мало.

"Ни один из белорусских вузов не готовит кадры для работы в этой сфере, — высказался супервайзер визуальных эффектов фильма **Алексей Дубко**. — *Те, кто работает, у нас либо самоучки, либо специалисты смежных специальностей. Если у нас начнут готовить аниматоров компьютерной графики, то появятся и свои "Пираты Карибского моря", и "Гарри Поттер".*

Как ни странно, но качество "Рыжика в Зазеркалье" напрямую зависело от предыдущей картины Туровой. Фильм "Новогодние приключения в июле", который не вызвал особо теплых отзывов ни у критиков, ни у зрителей, помог работникам киностудии сформулировать, чего же им все-таки не хватает для полного счастья. После выпуска этой картины стало ясно, что на производство современного кино "Беларусьфильм" просто не рассчитан.

"Работу над предыдущим фильмом мы завершили на энергии блаженного неведения, — призналась Елена Турова. — *Только благодаря "Новогодним приключениям в июле" на киностудии появился цех специальных киновидеотехнологий "Телекино". Все, что раньше нам приходилось делать за границей, сегодня мы делаем дома.*

Раньше доходило до того, что мы звонили в ту же Москву, чтобы спросить, где нам взять такую "зеленую тряпочку" для создания компьютерных эффектов. Мы понятия не имели, что такое "грин бокс" — помещение зеленого цвета, в котором проводятся съемки с наложением компьютерной графики. И только сейчас киностудия начала выползать из глубокой... трещины".

«Перебдить» Голливуд не получится

Говоря о "Рыжике в Зазеркалье", участники съемочной группы, как бы извиняясь, вспоминают "Новогодние приключения в июле" и обещают, что новая картина, конечно, будет лучше. Качественнее не только внешняя оболочка, но и сам сюжет. История Рыжика буквально рождена Туровой. Сказку она сочинила несколько лет назад для своей дочери и даже не помышляла о том, чтобы превратить историю в фильм.

На экране первоначальная идея Туровой претерпела некоторые изменения, но все равно сказка осталась сказкой — без модных нынче драк, обязательной дани политкорректности и взрослых шуток. Картина на 100 процентов детская. Главную роль в фильме исполняет 13-летняя **Диана Запрудская**, ученица 161-й минской школы.

Действия "Рыжика в Зазеркалье" переносят зрителей в сказочную страну Недалия, где главной героине Веронике, или Рыжику, предстоит помочь жителям королевства освободиться от злых чар колдуна Мортиса. К слову, в фильме снялась и режиссер картины Елена Турова. В кадре она появляется всего на несколько минут в образе королевы-матери с двумя принцами-близнецами на руках. Сыграла в фильме и ее дочь **Вероника**, которой Турова хочет посвятить книжный вариант сказки о Рыжике. Пока сборник сказок только готовится к публикации, дочь режиссера сыграла роль принцессы Шелковички.

"Рыжик в Зазеркалье" уже начали показывать в кинотеатрах страны. На "Беларусьфильме" очень надеются на успех картины у зрителей. Сама Турова не хочет тягаться с голливудскими картинами и не любит, когда ее работу называют *"белорусским ответом Гарри Поттеру"*.

Мария МАЛЕВИЧ.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

«Беларусьфильм» хиреет без директора?

Киностудия "Беларусьфильм" готова к реализации новых проектов, но многие дела тормозит отсутствие директора.

По словам главного редактора киностудии **Натальи Стежко**, существовать без руководителя — участь незавидная. Многие проекты приходится откладывать из-за того, что на киностудии нет начальника.

"Беларусьфильм" уже несколько месяцев живет без директора. После того как с **Владимиром Заметалиным** в декабре 2010 года не продлили контракт, его обязанности временно исполняет **Сергей Леонович**. Кто станет следующим директором киностудии, гадают все без исключения работники "Беларусьфильма".

"Кто будет следующим директором нашей киностудии, сказать сложно, — сообщила Наталья Стежко. — *Это решение зависит от министра культуры и президента страны".*

ГАСТРОЛЬ

Анастасия Волочкова в Могилев пока не едет

Концерт известной балерины, который должен был состояться 10 апреля, отменен.

Как сообщается на сайте Могилевской областной филармонии, *"концерт отменяется в связи с изменением концертного графика. Билеты принимаются до 10 апреля по месту приобретения. Администрация Могилевской областной филармонии и организаторы концерта приносят свои извинения".*

Тем временем на официальном сайте заслуженной артистки России в апрельской афише белорусские города упомянуты так: 9 апреля — Минск, 11 апреля — Брест. Но состоятся ли эти концерты — точно не известно.

Билеты на Гарика Сукачева распроданы

11 апреля в Большом зале Дворца Республики — концерт Гарика Сукачева и группы "Неприкасаемые".

Один из наиболее ярких фронтменов русского рока представит в Минске программу "Напои меня водой...".

Билеты на концерт Гарика Сукачева стоили от **60** до **250 тысяч** белорусских рублей. Но, как сообщается на сайте Дворца Республики, они все уже распроданы...

«Машина времени» споет по заявкам

7 апреля легендарная "Машина времени" выступит в Минске с программой, составленной на основе юбилейного тура, приуроченного к сорокалетию группы.

Учитывая то, что за время своего существования "Машина времени" записала 30 пластинок, перед "машинистами" встал сложнейший вопрос о том, какие же песни исполнять на концертах юбилейного турне. Группа доверилась своим фанатам. Любой меломан на официальном сайте группы мог проголосовать за любую из песен из любого альбома, которую он хотел бы услышать со сцены. Кроме того, музыканты включили в программу и несколько новых песен из последнего альбома "Машины не парковать", которые "машинисты" написали как раз во время подготовки к юбилею.

Чтобы послушать "Машину времени", нужно заплатить от **65.000** до **350.000** рублей, но в продаже остались лишь одиночные билеты.

Вячеслав Добрынин приедет не один

29 апреля в Большом зале Дворца Республики юбилейный концерт народного артиста России Вячеслава Добрынина "Ни минуты покоя... и в этом вся жизнь".

Как сообщается на афишах, поздравить юбиляра придут **Алексей Глызин, ВИА "Синяя птица", Ольга Зарубина, Валентина Легкоступова** и многие другие.

Билеты на Добрынина и компанию стоят от **50.000** до **250.000 рублей**.

Спешите увидеть Ваенгу!

18 мая в Минске даст концерт популярная Елена Ваенга.

Сольные концерты Ваенги проходят с большим успехом.

Стоимость билетов на Ваенгу не сильно отличается от общей тенденции — от **80.000** до **350.000 рублей**. Но несмотря на то, что до концерта звезды шансона еще почти два месяца, в продаже уже остались билеты лишь от 240.000 рублей.

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25—28 САКАВІКА 2011 г.

ШТО? ДЗЕ? КАЛІ?

26 сакавіка — 3 красавіка

МІНСК
Тэатры

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы
На сцэне Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў
27 — "Офіс".
На сцэне Цэнтральнага Дома афіцэраў
28 — "Сымон-музыка".
30 — "Чорная панна Нясвіжа".
31 — "Пінская шляхта".
2 — "Не мой".
Малая сцэна Канцэртнай залы "Мінск"
30 — "Беларусь у фантастычных апавяданнях".

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета
26 — "Мадам Баттерфляй".
27 — "Три поросенка", "Лебединое озеро".
28 — "Евгений Онегин".
29 — "Щелкунчик".
30 — "Риголетто".
31, 1 — "Ромео и Джульетта".
2 — "Севильский цирюльник".
3 — "Волшебная музыка", "Лебединое озеро".

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі
26 — "Сёстры Псіхеі".
28 — "Мужчины на грани нервного срыва".
29 — "Інфляцыя пачуццяў".
30 — "Дамавічкі".
31 — "Гісторыя двух сабак".
1 — "Адамавы жарты".
2 — "Што баліць?".
3 — "Каласы пад сярпом тваім".

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага
26 — "Земляничная поляна".
27 — "Русские водевили".
27 — "Звезды седьмого неба", "Русские водевили".
29 — "Мнимый больной".
30 — "Правда — хорошо, а счастье лучше", "Эдип".
31 — "Бег".
1 — "Женихи".
2 — "Свадьба Кречинского".
3 — "Звезды седьмого неба", "Идеальный муж".

Тэатр-студыя кінаакцёра
26, 27 — "Пигмалион".
28, 29, 31 — "№13".
1 — "Айседора. Танец любви".
2, 3 — "Поле битвы".

Беларускі дзяржаўны тэатр лялек
26 — "Жуткий господин Ау".
27 — "Красная Шапочка".
29 — "Синяя птица".
30 — "Марынка-крапіўніца".
31 — "Волшебная лампа Аладдина".
1 — "Веселый цирк".
2 — "Приключения Пин-Пина".
3 — "Василиса Прекрасная".

Беларускі дзяржаўны музычны тэатр
26, 27 — "Сильва".
29 — "Айболит-2002", "Голубая камея".
30 — "Буратино.by", "Голубая камея".
31 — "Красная Шапочка. Поколение NEXT", "Аршин Мал Алан".
2 — "Приключения бременских музыкантов", "Марица".
3 — "Золотой цыпленок", "Голубая камея".

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр
30 — "Текилалюбовь".

Сучасны мастацкі тэатр
26 — "Каникулы в Простоквашино", "Минск, я люблю тебя".
27 — "Малыш и Карлсон", "Родня".
1 — "Нетитулованный".
2 — "Пролетая над гнездом кукушки".
3 — "Малыш и Карлсон".

